Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варачаюцца.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к.; „ 3 „ — 2 р. — к.; „ 6 „ — 4 р. — к.; „ 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагароднім—20 к., мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нонпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нонпарэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок нонпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сыпісныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант .35 кап. За кожны дадатковы .15. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант .15. За кожны дадатковы .5. Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-ы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 157 (2049) Чацьвер, 14-га ліпеня 1927 г.

ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ У Б.С.С.Р.

Канкрэтна і практычна.

Што Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік **ня хоча вайны**—гэта ведама ўсёй міжнароднай і ўнутранай палітыцы, якую праводзіць наш урад. Гэта мы перш-на-перш паказалі тым, што як толькі заціхлі грымоты непасрэднае крывавае барацьбы, як толькі рабочыя і сяляне нашае краіны дабіліся некаторай перадышкі, адразу-ж пачалося масавае скарачэньне Чырвонай арміі, якое дало магчымасьць шмат фізычных і тэхнічных сіл перавесьці на фронт гаспадарчага будаўніцтва. Але што мы **не баімся вайны**, што мы здолеем сустрэць яе ў поўнай гатоўнасьці, гэта таксама намі даведзена. Аб гэтым, між іншым, сьведчыць і тое ажыўленьне, той энтузіязм, які выклікаў распачаты «тыдзень абароны».

Мы ня можам трымаць вялікай арміі, мы ня можам траціць на яе вялікіх сродкаў—мы бедныя для гэтага, у нас многа ёсьць гаспадарчых дзірак, якія пільна трэба заткнуць. У той час, як, напр., Англія траціць на ваенныя патрэбы 25 р. 20 к. на аднаго жыхара, СССР траціць усяго толькі 4 р. 50 кап. Сваю абароназдольнасьць мы павінны ўзмацніць за кошт дапамогі ў гэтай справе ўсяго нашага савецкага грамадзтва. Разьвінуць самадзейнасьць і ініцыятыву шырокіх працоўных мас у справе абароны савецкае краіны—вось задача, якую мы павінны паставіць сабе ў «тыдзень абароны». **Кожны рабочы і селянін павінен рыхтавацца да вайны, павінен быць гатовым да абароны сваёй зямлі, сваіх фабрык і заводаў.**

Апрача таго, разьвіцьцё ваеннай тэхнікі, увядзеньне новых спосабаў вайны (хімія, авіяцыя і г. д.), вялікае значэньне ў новых умовах тылу,—усё гэта з свайго боку патрабуе падрыхтоўкі да вайны ўсяго жыхарства, асабліва ў нашай прымежнай краіне. Новая вайна ня будзе мець сталых, выразна акрэсьленых франтоў, умацаваных цьвёрдай лініяй акопаў, бліндажоў і г. д. Яна нямінуча закране сваім жорсткім крылом мірнае жыхарства, уцягне яго ў сваю крывавую завіруху. Кожная вёска, кожная сядзіба будзе пляцдармам для ваенных сутычак, кожная вёска можа трапіць пад небясьпеку авіо-налётаў, хімічных атак і г. д. **Кожнаму рабочаму селяніну хаця-не-хаця, прыдзецца стаць удзельнікам барацьбы** і чым больш будзе падрыхтаваны ён да гэтае барацьбы, тым больш можа быць упэўнены ў цэласьці сваёй гаспадаркі, жывёлы у цэласьці жыцьця свайго і свае сям'і.

У «тыдзень абароны» менш за ўсё трэба нам захапляцца агульнымі гучнымі словамі, менш займацца пустой мітынгоўшчынай. Мала давесьці, што ў нас ёсьць небясьпека вайны, што гэта вайна пагражае жыцьцю і дабрабыту працоўных, пагражае адабраць у іх усе заваёвы, здабытыя імі ў Кастрычніку. Трэба канкрэтна і практычна ставіць пытаньні аб падрыхтоўцы да абароны, шукаць найбольш правільных спосабаў дасягнуць таго, **каб сярод нас ня было ні аднаго рабочага ці селяніна, ні аднаго сумленнага працаўніка, які-б ня ўмеў валадаць вінтоўкай, які-б не разумеў нічагуткі ў вайсковай справе, каб сярод нас ня было ніводнай работніцы ці сялянкі, якая-б ня ведала, як набіць стрэльбу свайму бацьку, мужу ці брату, якая-б ня здолела зрабіць санітарную дапамогу сваім братом па барацьбе за сацыялізм.** Трэба ўважліва прыглядзіцца да працы нашых клюбаў, нардамоў, хат-чытальняў; прасачыць, ці аддаюць яны патрэбную ўвагу вайсковай прапагандзе, ці арганізавалі яны вайсковыя куткі, ціры, стралковыя гурткі і г. д.,

І яшчэ адна вялікая задача павінна быць пастаўлена ў «Тыдзень Абароны» гэта задача ўвязкі гаспадарчай работы з работай па ўзмацненьні нашай абароназдольнасьці. Мы перш-на-перш павінны добра ўсьвядоміць, што **самы факт узвышэньня працоўнай дысцыпліны, вытворчасьці, энэргіі і ўздыму і штодзеннай гаспадарчай працы**—самы гэты факт ёсьць ужо праца на абарону. Але апрача таго, мы павінны прадугледзіць яшчэ адзін момант у гэтым напрамку. Мы павінны ўзяць такі курс у гаспадарчым будаўніцтве, каб злучыць яго з задачай прыстасаваньня да ваенных умоў, да ўмоў барацьбы. Як прамысловасьць наша, так і сельская гаспадарка павінны будавацца з такім разрахункам, каб у выпадку вайны з аднаго боку менш пацярпець ад ваенных руйнаваньняў, а з другога—дапамагчы нашай Чырвонай арміі, паслужыць на ўзмацненьне яе баявога тылу. Задача гэтая не на адзін дзень і не на тыдзень—гэта задача, якая ўвесь час павінна стаяць перад намі, пакуль будзем мы жыць пад небясьпекай нападу буржуазных дзяржаў. У «Тыдзень абароны» нам трэба яскрава высьветліць яе і ўразумець.

У рабоце па абароне трэба мець асаблівую вытрымнасьць і станавітасьць.

Канкрэтна і практычна павінны наставіць мы ўсе пытаньні, злучаныя з абаронай,—толькі тады будзе мець сэнс наша кампанія і дасьць рэальныя вынікі.

Да ўсіх працоўных.

(Адозва Менскага Гарадзкога Савету).

Рабочыя, сяляне і чырвонаармейцы!

Хутка дзесяць год, як рабочая кляса і ўсе працоўныя Саюзу будуюць пралетарскую дзяржаву, будуюць з посьпехам, умацоўваючы сацыялістычны фундамант гаспадаркі, якая расьце і разьвіваецца.

З найвялікшай нянавісьцю і злобай сачаць імпэрыялісты за разьвіцьцём нашае сацыялістычнае гаспадаркі. Іх заўсёдная мара—сарваць нашае будаўніцтва і зноў аднавіць уладу капіталу.

Пад кіраўніцтвам цьвёрдалобых кансэрватараў ідзе шалёная падрыхтоўка да новае вайны. Англія арганізуе і падтрымлівае ўсе контр-рэвалюцыйныя сілы ў Кітаі. Яна заносіць нож над кітайскай рэвалюцыяй з тым, каб, патапіўшы яе ў крыві, паспрабаваць разьбіць і апошт сусьветнай рэвалюцыі—СССР.

Імпэрыялісты надбухторваюць усе белагвардзейскія, шпіёнскія, бандыцкія сілы, спрабуюць іх арганізаваць для налётаў, падпалаў, узрываў, забойстваў унутры Савецкага Саюзу. Яны арганізуюць напады на нашых прадстаўнікоў у сваіх краінах, здрадніцка забіваюць іх рукамі наёмных забойцаў.

Рабочы, селянін, чырвонаармеец! Ты ведаеш, што Савецкі ўрад хоча міру, дабіваецца міру і робіць усё для таго, каб не дапусьціць вайны. Савецкі ўрад і ў далейшым зробіць усе захады да таго, каб захаваць мір, так неабходны для сацыялістычнага будаўніцтва.

Але капіталісты хочуць вайны, яны рыхтуюць вайну. І гэта абавязвае ўсю краіну, усіх працоўных у барацьбе за мір узмацняць абарону савецкае краіны, зрабіць яе магутнай і крэпкай, каб адбіць узброены напад.

Кожнаму працоўнаму мы павінны сказаць:

— Не пакідаючы і не аслабляючы сваёй штодзённай працы, рыхтуй сябе да таго, каб у кожны момант паўстаць на абарону сваёй пралетарскай айчыны супроць капіталістычнае зграі, супроць фабрыкантаў, намешчыкаў і банкіраў, якія прагнуць вырваць з рук рэвалюцыі фабрыкі, заводы і зямлю!

— Узмацняй дапамогу Чырвонай арміі —свайму вернаму ўзброенаму вартаўніку! Узмацняй і трымай сувязь з ёю!

— Працуй у стралковых гуртках і камандах ОСО-Авіяхіму. Усе ў ОСО-Авіяхім!

— Умацняй ахову сваіх фабрык, заводаў, электрастанцый, чыгунак, складаў!

— Узмацняй арганізаванасьць, актыўнасьць ва ўсёй нашай працы, будзь уважлівым вартаўніком на сваім пасту!

— Змагайся з расхлябанасьцю, разгільдзяйствам, нясумленнасьцю ў працы!

— Памятай, што пасьпешнае вырашэньне ўсіх пастаўленых гаспадарчых задач павышае абароназдольнасьць краіны!

— Памятай, што ў барацьбе супроць вайны мы не адны: нашы саюзьнікі—мільёны пралетарыяў Захаду і прыгнечаныя народы Ўсходу. Разам з імі мы змагаемся супроць імпэрыялістаў.

«Тыдзень Абароны» павінен быць тыднем смотру нашай гатоўнасьці да гэтага адпору.

У адказ на наглыя падкопы ангельскага імпэрыялізму многаміліённыя масы рабочых і сялян нашае краіны ў гэты тыдзень будуць дэманстраваць сваю гатоўнасьць да барацьбы за адстайваньне кастрычнікавых заваёў. Гэты тыдзень павінен пакласьці пачатак яшчэ больш упартай, энэргічнай рабоце працоўных па ўзмацненьні абароны краіны. У гэты тыдзень пралетарыят і працоўныя Менскае акругі яшчэ і яшчэ ўзмоцняць фонд «Адказ Чэмбэрлену», узмоцняць шэрагі ОСО-Авіяхіму, які арганізуе нашу дапамогу Чырвонай арміі.

Менскі гарсавет уносіць першы ўзнос у 1000 руб. на пабудоўку самалёта гарсавету Беларусі і выклікае ўсе гарадзкія саветы Беларусі зрабіць па яго прыкладу.

Няхай званьне сябра ОСО-Авіяхіму стане ганаровым для кожнага працаўніка!

Няхай кожны праверыць і ўзмоцніць сваю баявую вывучку!

Няхай капіталістычны сьвет бачыць нязьменную цьвёрдасьць, рашучасьць, адзіную сплочанасьць шэрагаў працоўных Саюзу, гатовых да абароны межаў пралетарскае дзяржавы.

Рабочыя, сяляне, чырвонаармейцы, — будзьце на варце!

У змаганьні за мір умацоўвайце абарону Савецкага Саюзу!

Усе на смотр нашай вайсковай магутнасьці ў «Тыдзень Абароны»!

Аб'яднаваму фронту імпэрыялістаў супроцьпаставім непераможную сілу саюзу рабочых і сялян!

Няхай жыве назаўсёды савецкая ўлада ва ўсім сьвеце!

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў.

Будзем гатовы да вайны.

Летні сад саюзу харчавікоў у гэты дзень меў выключна вайсковы выгляд. Плякаты і лёзунгі з усіх бакоў папераджалі аб небясьпецы будучай вайны. Заклікалі ў шэрагі ОСО-Авіяхіму.

Сад перапоўнен харчавікамі: «Будучая вайна» ня можа іх ня цікавіць.

Даклад рабіў прадстаўнік ОСО-Авіяхіму с. Грыневіч. Дакладчык гаварыў аб тым, якая будзе магчымая вайна, колькі ахвяр прынясе яна нам. Ня «склаўшы рукі» чакаць вайны павінны мы: трэба арганізаваць абарону, узмацніць тыл — вось нашы задачы.

Ухвалілі рэзалюцыю:

— Ажывіць працу ячэйк ОСО-Авіяхіму.

Арганізаваць цір.

Пасьля ўрачыстай часткі прысутныя глядзелі кіно-фільму «Будучая вайна». Фільма выклікала баявы настрой.

Расхадзіліся з аднэй думкай. Да магчымае вайны, будзем гатовы. **А—і.**

Усім прафарганізацыям саюзу сел.-гасп. і лясных рабочых Беларусі, усім сел.-гасп. і лясным рабочым БССР.

Дарагія таварышы.

Бандыцкія налёты імпэрыялістых на савецкія прадстаўніцтвы ў Пекіне, Шанхаі і Лёндане, разрыў кансэрватыўным урадам Англіі дыплёматычных зносін з Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік забойства т. Войкава, сыстэматычна падрыхтоўваемы сусьветным імпэрыялізмам наход супроць Савецкага Саюзу выклікалі з боку шырокіх рабочых мас СССР глыбокі і сур'ёзны рух за ўзмацненьне абароназдольнасьці нашае краіны.

Зважаючы настроі і жаданьні ўсіх сельска-гаспадарчых і лясных рабочых Беларусі, цэнтральнае праўленьне, кіруючыся пастановай VIII-га Усебеларускага Зьезду саюзу, зьвяртаецца да ўсіх сельска-гаспадарчых і лясных рабочых БССР і да ўсіх органаў саюзу з прызывам шырока арганізаваць шляхам адлічэньняў са зваротных сродкаў органаў саюзу і адначасовых дабраахвотных адлічэньняў з заробку сельска-гасп. і лясных рабочых збор сродкаў на пабудову вайсковага самалёта „сельска-гаспадарчы і лясны рабочы СССР“ у эскадрыльлю «наш адказ Чэмбэрлену».

Адлічэньні са зваротных сродкаў органаў саюзу праводзяцца пастановамі пленумаў апошніх, адлічэньні-ж з зарплаты рабочых праводзяцца па пастановах на менш 2/3 агульных сходаў рабочых. Усе сабраныя сродкі павінны зараз-жа накіроўвацца у ЦП саюзу на бягучы рахунак Усекабанку № 187, для накіраваньня ва ўсесаюзны фонд пабудовы самалёта пры газэце „Батрак“.

Разам з гэтым, цэнтральнае праўленьне саюзу зьвяртаецца да ўсіх сельска-гаспадарчых і лясных рабочых БССР з прызывам значна ўзмацніць працу па вывучэньні вайсковых ведаў, пашырэньне ўдзелу ў працы ОСО-авіяхіму, а таксама ўзмацніць працу па прыцягненьні шырокіх колаў сялянства ў справу ўзмацненьня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

На ўзрослую небясьпеку вайны, на спробу ворагаў сарваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва сельска-гаспадарчыя і лясныя рабочыя БССР, разам з усёй рабочай клясай СССР, адкажуць дружнай працай па ўзмацненьні абароназдольнасьці нашае краіны.

Ніводнага сельска-гаспадарчага і ляснага рабочага па-за шэрагамі ОСО-Авіяхіму.

Кожны сельска-гаспадарчы і лясны рабочы павінен унесьці сваю капейку на пабудову самалёта «сельска-гаспадарчы і лясны рабочы СССР».

Справа абароны Савецкага Саюзу—справа ўсіх працоўных.

Усе на абарону СССР!

З таварыскім прывітаньнем

ШТО МЫ РОБІМ У ТЫДЗЕНЬ АБАРОНЫ.

Наш полк прымае шчыры ўдзел у кампаніі «Тыдзень абароны». Напершае—сярод вайскоўцаў праведзена кампанія па збору сродкаў на «Наш адказ Чэмбэрлену». Усяго ўжо сабрана звыш 80 рублёў.

Акрамя гэтага полк праводзіць вельмі важную кампанію па збору падпіскі на цэнтральную вайсковую газэту «На страже». Перад сабой полк паставіў мэтай, каб кожны чыр-ец, які будзе ў гэтым годзе дэмабілізаваны, выпісаў газэту. Да гэтай справы будуць прыцягнуты шэфы рот палка (ёсьць роты, якія ўжо выпісалі на 100 проц.).

Шэфамі на заводах будзе праведзена кампанія па растлумачэньню небясьпекі вайны, росту ўзбраеньня ў капіталістычных дзяржавах і г. д.

У ротах з удзелам шэфаў і камсамольскіх ячэек, будуць праведзены стральбы і экскурсіі.

Намячаецца выезд у надшэфны палку сельсавет, дзе таксама будзе праведзена аднаведная работа.

17 ліпеня полк будзе прымаць удзел у лягерным выступленьні ячэек Осо-авіяхіму, на гэты дзень запрашаюцца шэфы палка рабочыя саюзу будаўнікоў.

Трэба каб уся праведзеная ў гэты тыдзень работа ня скончылася 17 ліпеня, а працягвалася ўвесь час. Гэта вялікая задача па ваенізацыі насельніцтва палком будзе выканана. **К.**

ШТО МЫ ЗРАБІЛІ ДЛЯ ВЁСКІ.

Наш 6 полк трымае шэфства над Самахвалавіцкім сельсаветам, у які ўваходзяць вёскі Паперня, Дубаўляны і інш.

За час шэфства палком для вёскі зроблена многа. Цяпер сяляне чакаюць шэфаў і ўсе свае недахопы выкладаюць, каб атрымаць ад шэфа параду, ці дапамогу.

Палком у вёс. Паперня пастаўлен радыё-прыёмнік, куды сяляне з вялікай ахвотай ходзяць паслухаць апошнія навіны.

Гэтаю вясною для бяднейшых сялян было па невялічкай цане адпушчана 3 кані, а восеньню будзе адпушчана яшчэ каля 20 коняй. Полк прыняў удзел у пасяўной кампаніі, на якую было сабрана сярод сяброў шэфтаварыства і сабрана з другіх крыніц 180 рублёў. Акрамя гэтага полк падарыў сялянам малацілку.

— Вось гэта дык шэф,—кажуць сяляне.

Але полк не толькі праводзіць работу ў напрамку матэр'яльнай дапамогі. Ім вядзецца і культурная работа.

Для вёскі выпісваюцца газэты, журналы. Пры мясцовым каапэратыве арганізован, з дапамогай самых сялян, куток «маці і дзіця». У хаце-чытальні арганізован вайсковы куток і складзен вайсковы гурток, які ўжо распачаў сваю працу. Усе кампаніі праводзяцца з удзелам палка. Апошняя кампанія «Тыдзень абароны» дала добрыя вынікі. Сяляне з ахвотай адгукнуліся на тую небясьпеку, якая пагражае Савецкаму Саюзу і сабралі грошы на ўзмацненьне баяздольнасьці краіны.

Полк і далей будзе весьці тую работу, якую ён праводзіць, ня гледзячы на тое, што да падшэфнікаў далёка і што полк вядзе вучобу на падрыхтоўцы сябе да будучай вайны. **С. К.**

Новыя ячэйкі ОСО-Авіяхіму.

«Тыдзень Абароны» значна ажывіў працу ОСО-Авіяхіму на мясцох. У Менску за першыя дні «Тыдню» арганізавалася шмат новых ячэек т-ва. Гэткую ячэйку арганізавалі і рабочыя гарбарні № 3, яўрэі-сяляне арганізавалі гэткую ячэйку пры сваёй хаце-чытальні (Нярэспа). У новых ячэйках звыш 100 сяброў. Ячэйкі ўжо правялі некалькі дакладаў; адбываюцца практычныя заняткі. Паступаюць весткі аб арганізацыі новых ячэек і з іншых месц. Ячэйкам адразу-ж выдаецца літаратура і сродкі на першую працу.

Пабудуем самалёт „Кіно-работнік“.

Работнікі саюзу мастацтва зараз у большасьці ў адпуску. Артысты беларускага і яўрэйскага тэатру на курорце. І ўсё-ж 12 ліпеня, калі назначылі сход, прысьвечаны «Тыдню Абароны», у летнім тэатры «Прафінтэрн» сабралася каля 150 чалавек.

Дакладчык ад ОСО-Авіяхіму ня прымусіў сябе доўга чакаць. Даклад пачаўся ў тэрмін. Цягнуўся нядоўга, але яскрава адбіў і чарговыя задачы ОСО-Авіяхіму, і нябясьпеку вайны. Артысты задавалі пытаньні, выказваліся.

Пасьля дакладу ОСО-Авіяхіму быў зроблены даклад аб сучасным міжнародным становішчы. Даклад рабіў старшыня ЦП саюзу т. Табайнік.

Сход ухваліў шэраг канкрэтных настаноў. Галоўная з іх—прыняць удзел у пабудоўцы эскадрыльлі імя працаўнікоў мастацтва. Не адсталі і кіно-работнікі, якіх ня мала было на сходзе. Яны ўхвалілі распачаць збор сродкаў на пабудову свайго самалёту «Кіно-работнік». Дзеля гэтага, кіно-работнікі ў бліжэйшы час правядуць шэраг панядзелкаў, збора ад якіх пойдзе выключна на пабудову самалёта.

У сваю чаргу артысты рашылі паставіць некалькі спэктакляў, збор з якіх перадаць у фонд абароны.

Сход прайшоў надзвычайна актыўна і дзелавіта.

Пажадаем кіно-работнікам хутчэй бачыць свой родны самалёт у паветры. **Жэк—й.**

„Чырвоны Гарбар“.

Рабочыя ўсіх гарбарных заводаў Беларусі атрымалі ад свайго кіраўнічага органу—ЦП саюзу —наступны ліст:

Пабудуем свой самалёт і назавём яго «Чырвоны Гарбар».

Гэты ліст чыталі з захапленьнем. Зараз на стале ЦП гара толькі атрыманых рэзалюцый. І ўсе яны гавораць аб адным: «самалёт «Чырвоны Гарбар» будзе пабудаваны.

Рабочыя менскіх гарбарняў на пабудову самалёту адлічылі аднадзённы заробак, ЦП саюзу на гэтую справу ахвяравала 100 руб.; паступаюць узносы ад асобных фабкомаў.

Гарбары пабудуюць свой самалёт. **В.**

У ФОНД „НАШ АДКАЗ ЧЭМБЭРЛЭНУ“.

Унашу па вызаву Паўлавай 5 рублёў і выклікаю: Мушыц (Сав. Бел.), Мількамановіча (НКФ), Лукьяновіча (БІКА), Троцкага (БІКА), Каржуева (НКСЗ), Карніловіча (Дзяржплян), Сайкова (БІКА), Чыжуна (Акрза), С. Александровіча (Акрза) на гэтую ж самую суму.

Е. Ільясевіч.

Па вызаву т. Пагуды ўносім па 5 руб. і выклікаем усіх агентаў рэдакцыі «Звезда» і «Акцябр» унесьці па 5 р.

І. Шмэркович, Ліўшыц.

Унашу па вызаву т. Паўлавай 5 руб. і выклікаю на тую-ж суму т. т. Цімінскага (ДВБ), Кантаровіча (ДВБ), Вайткевіча (Бел. аб'ядналая школа), Гуліса (1-я друкарня), Александровіча (Наркамфін) Смоліч (ІБК), Смольскага Мацея (ЦСУ), Жарскага (ДВБ) Пятрукевіча (НКЗ), Корсака (абаронцу).

З. Паўтаржыцкая.

Па вызаву Я. Садоўскага, унашу 5 руб. і выклікаю яго-ж даўнясьці да гэтай сумы, як унёсшага замала. Апроч гэтага выклікаю: Сьвераноўскую, Маронка, Еселевіча, Фрыдмана, Кіна, Бутомава, Ладнага і Бялінскага.

С. Азерскі.

Па вызаву тав. Пагуды ўнашу 5 руб. і выклікаю: т. т. Сітнікава, Штэйна (Жакт № 29), Фішэра (Сав. Бел.), Левіна, Валуевіча (экспэд. Бел. Вёска), Крупіча В., Сташкевіча, Якубоўскага (эксп. „Звезда“), Сеньчука (экспэд. пашт.-тэл. к-ры), усіх па 5 руб.

Крупіч А.

Транспартнікі адпусьцілі 500 р.

ЦП саюзу транспартнікаў адпусьціла 500 руб. у фонд абароны краіны. Збор сродкаў па саюзу транспартнікаў праходзіць з вялікім посьпехам. Па прыкладу ЦП зрабілі і мясцкомы.

Працоўная капейка—на абарону краіны.

3 м-цы—па 1 проц.

Служачыя Аршанскага акр. вык. камітэту, статбюро, сац. забясьпекі і камунгандлю ў фонд пабудовы эскадрыльлі „САВГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫ“ пастанавілі адлічыць 1 проц. ад свайго заробку ў працягу 3-х месяцаў і выклікаюць іншыя групкомы і мясцкомы Савгандальслужачых зрабіць тое-ж самае.

Скарбоначны збор.

Першы дзень скарбоначнага збору на карысьць самалёта імя Осо-Авіяхіму даў ва Менску каля 500 рублёў. З гэткім-жа посьпехам збор прайшоў і па іншых гарадох БССР.

НА АБАРОНУ.

Мясцком ВСНГБ адлічыў на абарону 25 руб. Служачыя апарату ВСНГ адлічылі адзін процант свайго месячнага заробку, што дасьць прыблізна 75 руб.

НІВОДНАГА ЧЛЕНА САЮЗУ ПА-ЗА ШЭРАГАМІ ОСО-АВІЯХІМУ.

Агульна-гарадзкі сход членаў саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, адказваючы на правакацыю імпэрыялістаў, пастанавіў адлічыць адзін процант месячнага заробку на пабудоўку самалёта „Сельхозлесрабочий“ і на эскадрыльлю „Наш адказ Чэмбэрлену,“ а таксама пашырыць работу па ваенізацыі сярод членаў саюзу.

ЛЁТАРЭЯ «НА АБАРОНУ».

Белпапертрэст арганізаваў рэчавую лётарэю. Увесь збор ад гэтай лётарэі паступіць на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны. У лётарэі ёсьць шмат каштоўных рэчаў. Білеты (па 25 капеек) купляюцца на расхват.

ХОЧАШ МІРУ—РЫХТУЙСЯ ДА ВАЙНЫ.

Мясцком Белнайгандлю адлічыў на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны 100 р. Служачыя адлічылі адзін процант ад свайго месячнага заробку. Апроч гэтага, Белнайгандаль адлічыў 100 р з фонду паляпшэньня быту рабочых.

Праца ячэек Осо-Авіяхіму.

„Бойка“ пад Бабруйскам.

Бабруйскі Акруговы Савет ОСО—Авіяхіму 10-га ліпеня правёў інсцэніроўку нападу на горад Бабруйск. Інсцэніроўка прайшла з вялікім посьпехам. У ёй удзельнічала звыш 1000 чалавек.

Адначасова з гэтым была праведзена паказальная паветраная бойка, у якой прынялі ўдзел 10 самалётаў.

Выстаўка паштовых галубоў.

У «Тыдзень Абароны» Віцебская спартыўная падсэкцыя ОСО-Авіяхіму наладжвае выстаўку паштовых галубоў. У выстаўцы прымуць удзел вайскова-галубовая станцыя і члены падсэкцыі галубазнаўцаў.

Выстаўка адбудзецца ў «Доме Чырвонай арміі».

Дрэваапрацоўнікі трымаюць вінтоўку ў руках.

Рабочыя заводу «Дрэваапрацоўнік» пастанавілі закупіць для свайго гуртка ОСО-Авіяхіму вінтоўкі, якія ўжо закуплены. Ні аднэй дарэмна выпушчанай кулі!

Стралковыя спаборніцтвы начскладу запасу.

(Віцебск).

17-га ліпеня на ціры Авіёбрыгады адбудуцца стралковыя спаборніцтвы з удзелам начскладу запасу. Кожная ячэйка Осо-Авіяхіму выдзяляе 2 чал. начскладу запасу.

Умовы спаборніцтваў: страляць на 100 мэтраў з рукі бяз упору з трохлінейнае вінтоўкі баявым патронам у міжнародную мішэнь № 5, размерам 60×60 сантымэтраў.

Спаборніцтвы індывідуальныя. Тыя, што зоймуць два першыя месцы, атрымаюць у нагароду жэтоны Осо-Авіяхіму.

Літаратура для ячэек ОСО-Авіяхіму.

Цэнтральны савет ОСО-Авіяхіму СССР прыслаў вялікую партыю папулярнай вайсковай літаратуры для беларускіх ячэяк т-ва. Літаратура ўжо разаслана па мясцох. Кожная ячэйка атрымала шэраг кніжак на тэму: як разгарнуць працу ОСО-Авіяхіму, спэцыяльныя плякаты, лёзунгі і экспанаты для вайсковых куткоў.

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ НАШАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫЦЫ.

(Адказ на лісты і запіскі).

Наша нацыянальная палітыка ўзьняла да актыўнага палітычнага і культурнага жыцьця шырокія пласты працоўных, павысіла іх грамадзянскую актыўнасьць і самасьвядомасьць, умацавала іх сувязь з Саюзам Савецкіх Рэспублік, даказала, што толькі дыктатура пралетарыяту можа забясьпечыць сапраўдную нацыянальную волю і магчымасьць культурнага разьвіцьця ўсім, без выключэньня, нацыянальнасьцям. Ня трэба было-б вяртацца да гэтых самых найбольш элемэнтарных ісьцін пралетарскай нацыянальнай палітыкі, калі-б не некаторыя таварышы, якія за гэтыя гады ўсё яшчэ не ўсьвядомілі гэтай простай палітычнай азбукі.

Таму, і толькі таму, нам прыходзіцца вяртацца да азбукі нацыянальнай палітыкі пралетарскай дзяржавы.

Член нашай партыі тав. Х. нам піша:

«Мы зараз перажываем пераходны пэрыяд да сацыялізму, а таму нацыянальнай палітыкай трэба дасягаць хутчэйшай асыміляцыі нацый і іх нацыянальных традыцый. Нашай беларусізацыяй узмацняюцца традыцыі, паглыбляюцца, тым адсоўваючы пытаньне аб асыміляцыі нацый і г. д. У той час, калі наша эканамічная палітыка накіравана на набліжэньне да сацыялізму. Наша нацпалітыка накіравана не на зьнішчэньне нацыянальнасьцяў, а на іх разьвіцьцё. Тут, на мой погляд, ёсьць супярэчнасьць між эканамічнай палітыкай і нацыянальнай палітыкай БССР».

Ці верны гэтыя палажэньні т. Х?

Не, зусім ня верны. Пад яго архірэвалюцыйнай фразэалёгіяй хаваецца напершае, неразуменьне задач пралетарыяту, падругое, перажыткі ідэалёгіі вялікадзяржаўнасьці ранейшай пануючай нацыі.

Ці верна, што нацыянальная палітыка камуністаў павінна ставіць сваёю мэтаю магчыма больш шпаркую асыміляцыю нацый?

Не, ня верна. На справе мы бачым, што за дзесяць гадоў існаваньня дыктатуры пралетарыяту ня толькі культурна ўмацаваліся слаба разьвітыя раней нацыянальнасьці, але і шэраг плямён, якія не ўсьвядомілі сябе да рэвалюцыі, як нацыі, ператварыліся ў нацыі ў сапраўдным сэнсе гэтага слова і распачалі стварэньне сваёй культуры.

Пралетарская дзяржава ня толькі не павінна процідзейнічаць, але, наадварот, павінна ўсяляка дапамагаць гэтаму працэсу. Напершае, таму, што толькі на асновах разьвіцьця нацыянальнай мовы, вучоту ўсіх асаблівасьцяй кожнай нацыі, у тым ліку і ўсіх яе традыцый, магчыма шырокае ўцягненьне працоўных мас у актыўнае палітычнае жыцьцё. Мы ведаем, што моры ня толькі і ня столькі раз'ядноўваюць краіны, сколькі служаць шляхамі зносін між імі, злучаючы іх. Тое-ж самае верна і ў адносінах мовы. Падругое, таму, што, сацыялістычнае будаўніцтва патрабуе шпаркага культурнага ўздыму мас, а гэты ўздым немагчымы іначай, як на асновах нацыянальнай мовы, асаблівасьцяў, традыцый. Усякая іншая пастаноўка пытаньня аб культурным уздыме ёсьць арыстакратычная верхавінная пастаноўка. Арыстакратамі, якія пакідаюць масы самым сабе, зьяўляюцца тыя кітайскія радыкалы, якія гавораць, што ў Кітаі пісьменнасьць і культуру трэба разьвіваць на ангельскай мове, бо кітайская мова не падыходзіць да навукі мастацтва. Арыстакратамі былі тыя расейцы, якія сто гадоў назад запэўнялі, што для навукі расейская мова не падыходзіць, а неабходна французская мова.

Арыстакратамі, па сутнасьці зьяўляюцца і тыя, якія цяпер «ня вераць», што на беларускай, украінскай і іншых мовах можа быць вышэйшая школа, літаратура і г. д., якія «ня вераць» што беларусізацыя не ў інтарэсах чыноўнікаў, інтэлігентаў пісьменьнікаў, а ў інтарэсах шырокіх мас. «Арыстакратамі» зьневажаючымі культурным уздымам мас, таксама зьяўляюцца тыя, хто ня хоча гэтага зразумець і гэтаму дапамагчы.

Палітыка асыміляцыі чаго-б гэтае ні каштавала, асыміляцыя пераважна, ёсьць палітыка прыгнечаньня і эксплёатацыі культурна разьвітымі нацыянальнасьцямі адсталых і малакультурных нацыянальнасьцяў. Яна была ўласьціва для царызму, яна ўласьціва капіталістам, але яна ня мае нічога агульнага з палітыкай пралетарскай дзяржавы.

Стварэньне культурных цэнтраў на акраінах на вялікадзяржаўнай дзяржаўнай мове, стварэньне на нацыянальных акраінах школы на вялікадзяржаўнай дзяржаўнай мове праследавала зусім не далучэньне малых і адсталых нацыянальнасьцяў да больш высокай культуры, а палітычную і эканамічную эксплёатацыю іх шляхам дэнацыяналізацыі інтэлігентаў і культурна-разьвітай верхавіны. Тое, што ў Беларусі ўся служылая інтэлігенцыя імкнулася вывучаць расейскую мову, усьвядоміць расейскую літаратуру, гаварыць толькі парасейску, усё гэта тлумачылася не інтарэсамі культурнага ўздыму мас, а чыноўніцка-кар'ерыскімі пабуджэньнямі гэтай верхавіны; тое, што значная частка сялян імкнулася даць адукацыю сваім дзецям па расейскай мове, тлумачыцца зусім не меркаваньнямі аб далучэньні сялянства да больш высокай культуры, а меркаваньнямі аб іх выхадзе на больш забясьпечаны шлях, чыноўніцкімі зьберажэньнямі. Беларусізацыя зусім не зьяўляе сабой адмовы ад вывучэньня расейскай мовы, як мовы маючай шырокую марксыцкую літаратуру, прызнанай у міжсаюзных зносінах і аднэй з чатырох дзяржаўных моў БССР, і дае толькі іншы, больш лёгкі і выгодны падыход да яе шырокім масам.

Наша нацыянальная палітыка, палітыка беларусізацыі зусім ня супярэчыць нашай эканамічнай палітыцы. Яны зьяўляюцца дзьвума складанымі часткамі адзінай палітыкі савецкай дзяржавы —палітыкі сацыялістычнага будаўніцтва. Наша эканомпалітыка праследвае эканамічны ўздым усіх бяз выключэньня частак Савецкага Саюзу, накапленьне пралетарскіх кадраў, якія забясьпечваюць моц дыктатуры пралетарыяту, узьняцьце ўсіх бяз выключэньня раёнаў і вобласьцяў СССР на больш высокі ўзровень цывілізацыі, культуры і тэхнікі, што зьяўляецца абавязковай умовай сацыялістычнага будаўніцтва. Наша нацыянальная палітыка праследвае ўцягненьне ўсіх бяз выключэньня працоўных СССР у актыўную творчую працу па ўзмацненьні дыктатуры пралетарыяту, ажыўленьні працы саветаў, прафсаюзаў, узмацненьні саюзу пралетарыяту і бяднейшага сялянства з сярэднім сялянствам, узьняцьця ўсіх бяз выключэньня раёнаў і вобласьцяў СССР на больш высокі ўзровень цывілізацыі, культуры і тэхнікі. У аднэй і ў другой частцы больш культурныя раёны і рэспублікі падтрымліваюць больш адсталых. Супярэчнасьць паміж гэтымі дзьвума часткамі нашай палітыкі толькі здаецца і то толькі людзям палітычна мала-вопытным, не разумеючым, што мова падзяляе народы толькі ў першай стадыі іх разьвіцьця, а ў далейшым збліжае, яднае, таксама, як моры і акіяны.

Сацыялізм мы будуем не на нацыянальнай падставе, а на падставе клясавага адзінства пралетарыяту ўсіх краін.

Наша партыйная праграма ня ставіла і ня ставіць перад намі задач зьнішчэньня нацыянальнасьцяў, мы гаворым толькі аб зьнішчэньні дзяржаўных адзінак. Сацыялізм не далей веку будзе зжывацца з наяўнасьцю розных нацыянальнасьцяў, з якіх кожная будзе карыстацца благамі новай культурнай эпохі, эпохі сацыялістычнае культуры, пры дапамозе сваёй роднай мовы.

У нашай нацыянальнай палітыцы яшчэ адно пытаньне, якое непакоіць некаторых.

Калі камуністы працуюць ці дапамагаюць працы па разьвіцьцю і абагачэньню мовы, па стварэньню тэрміналёгіі, па стварэньню ачагаў тэатральнай, музычнай і г. д. культуры, па распрацоўцы народнага эпаса, дык гэта праца нічым не адрозьніваецца ад працы, якую ў гэтых галінах вядуць у эпоху нацыянальнага адраджэньня і стварэньня элемэнтаў буржуазнай культуры буржуазная і дробнабуржуазная інтэлігенцыя.

Але гэта не павінна нікога непакоіць.

Мы ўзялі ўладу ў адсталай і малакультурнай краіне, добра ведаючы, што ў нас няма нагатове ўсіх прадпасылак для сацыялістычнае культуры. Сацыялістычная культура вымагае вялікага накапленьня матэр'яльных элемэнтаў культуры, без якіх нельга перайсьці да вырашэньня больш высокіх задач.

У зьвязку з тым, што ў культурным будаўніцтве Беларусі задачы пэрыяду нацыянальнага адраджэньня і накапленьня элемэнтаў культуры ня былі выкананы да пралетарскай рэвалюцыі, пралетарская дзяржава бярэ на сябе задачы іх выкананьня, пры гэтым у значна меншы тэрмін, чым гэта змагла зрабіць буржуазея, каб гэтым скончыць задачы нацыянальнага адраджэньня, і пасоўвацца шпаркімі крокамі далей да выкананьня задач па арганізацыі сацыялістычнай культуры. Але выконваючы гэтыя задачы палітычна ўжо зьнішчанай эпохі, пралетарская дзяржава ставіць сваёй мэтаю не стварэньне буржуазнай культуры, а задачы культурнага ўздыму працоўных мас, забесьпячэньне адразу-ж у гэтых нацыянальных формах пралетарскага зьместу, і гэтым распачынае арганізацыю культуры новай сацыялістычнай грамады.

Такім чынам у палітыцы пралетарскай дзяржавы задачы пэрыяду нацыянальнага адраджэньня ператвараюцца ў задачы эпохі сацыялістычнага будаўніцтва.

В. Кнорын.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

СПРЭЧКІ ПА ЗАМЕЖНАЙ ПАЛІТЫЦЫ Ў ПАЛАЦЕ ВОБШЧЫН.

Англа-савецкія дачыненьні.

ЛЁНДАН, 12-VII. У часе ўчарайшых спрэчак у палаце вобшчын выступіў кансэрватар Бутбі (адзін з чатырох кансэрватараў, якія выяжджалі год назад у Маскву). Ён падрабязна спыніўся на англа-савецкіх дачыненьнях. Бутбі пачаў з зазначэньня, што „паколькі дыплёматычныя зносіны застаюцца перарванымі, становішча ня можа быць ня цяжкім.

Наконт перамоў у Жэневе Бутбі заявіў, што ўсе заявы бескарысны, паколькі ў іх ня ўдзельнічае СССР. У адносінах да СССР з моманту разрыву заўважаны некаторыя пагоршаньні становішча з прычыны таго, што так званае „расейскае пытаньне" некалькі страціла сваю вострасьць у якасьці спрэчнага пункту між кансэрватарамі і рабочай партыяй.

«Гэта ўсё даказвае,—сказаў Бутбі, што раней, чымся дамагчыся задавальняючага вырашэньня расейскай праблемы, мы павінны выступіць перад бальшавікамі і савецкім урадам адзіным фронтам».

Бутбі крытыкаваў плынь, якая імкнецца праз эканамічнае і ваеннае ўздзейнічаньне пагоршыць становішча ў СССР. Водлуг яго думкі, дзяржаўны пераварот у СССР немагчымы. Бутбі дамагаўся, каб ангельскі ўрад выступіў з выразнай заявай і зазначыў умовы, на якіх магчыма аднаўленьне зносін між Англіяй і СССР, а таксама, каб рабочая партыя падтрымала ўрад у гэтых адносінах.

„Калі апазіцыя,—заявіў ён,—ідзе проці ўраду і пасылае сваіх прадстаўнікоў да савецкага ўраду за сьпіною ангельскага ўраду, дык як вы можаце спадзявацца, каб савецкі ўрад паверыў, што мы думаем як раз тое, што гаворым, ці што яно не дачакаецца больш спрыяючых умоў з боку апазіцыі, калі яна прыдзе да ўлады. Адзіны шлях дамагчыся згоды з СССР у тым, каб ангельскія палітычныя партыі спынілі ўнутраныя спрэчкі".

„Рукі прэч ад Расеі".

Заўвагі генэрала Шэнайха аб Чырвонай арміі.

БЭРЛІН, 11-7. «Дрэздэнэр Фолькс-цайтунг» зьмяшчае артыкул генэрала Шэнайха, які паведаўся нядаўна ў СССР. У артыкуле, між іншым зазначана: «Чырвоная армія зьяўляецца галоўнаю народнаю школаю ў краі. Яна дае чырвонаармейцам ня толькі вайсковыя веды, але і агульную адукацыю. Лік няпісьменных за апошніх 4 гады значна зьменшыўся. Вялікую заслугу ў гэтым мае Чырвоная армія. Чырвонаармеец набывае ў арміі марксісцкі кругагляд.

Я лічу, што Чырвоная армія набудавана на зусім новай сыстэме ўзаемадачыненьняў між начальнікамі і падначаленымі. У службовы час дысцыпліна ў Чырвонай арміі такая-ж суровая, як і ў нас, а ў нясулжбовы час між камандзірамі і салдатамі няма ніякой розьніцы. Усе яны таварышы. У Чырвоную армію ідуць з ахвотаю. Гэта тлумачыцца магчымасьцю набыць у арміі культурнае разьвіцьцё. Я папераджаю ўсіх, хто апанавалі планы абкружэньня СССР: «Рукі прэч ад Расеі». Хто не паслухаецца—апячэ сабе пальцы аб Чырвоную армію».

На канфэрэнцыі 3-ох дзяржаў.

ПАРЫЖ, 12-VII. Жэнеўскія карэспандэнты амэрыканскіх газэт у Парыжы паведамляюць, што ў апошні момант у закулісных перамовах на канфэрэнцыі трох дзяржаў намецілася згода на падставе амэрыканскіх прапаноў аб агульным таннажы дапаможных крэйсэроў. Спрэчнымі застаюцца пытаньні аб разьмерах крэйсэроў і калібры гармат. Як паведамляе «Чыкага Трыбюн», Гібсон заявіў: «Пакуль што мы займаліся арытмэтычнымі выкладкамі, а цяпер на сцэну выступілі палітычныя фактары, якія патрабуюць пераходу да тактыкі ўзаемных уступак».

Польска-савецкія дачыненьні.

ВАРШАВА, 12-VII. «Кур'ер Поранны» паведамляе, што ў суботу ў Маскву выяжджае польскі пасол у СССР Патэк, які прывязе з сабою адказную польскую ноту. Водлуг вестак газэты, польскі ўрад лічыць, што „напружаная атмасфэра выкліканая агрэсыўнасьцю другой савецкай ноты мінула, і надышоў момант, калі можна спакойна высьветліць усе непаразуменьні». Тон друку ў апошнія дні дае падставу думаць, што гэтым пададзен сыгнал да адбою.

Замежная палітыка Румыніі.

«Інтарэсы Румыніі саўпадаюць з інтарэсамі Англіі».

ВЕНА, 12-VII. Румынскі міністар замежных спраў у гутарцы з карэспандэнтамі чужаземнага друку заявіў: «Асноваю замежнай палітыкі Румыніі зьяўляецца захаваньне спакою, але няма спакою без міжнароднага парадку і поўнай ўпэўненасьці ў моцнасьці гэтага парадку.

З гэтае прычыны, каб забясьпечыць спакой, патрэбна захаваньне міжнароднага парадку, устаноўленага ў 1920-21 г. г. Неабходна ўсімі мерамі дамагацца захаваньня сучасных граніц у Эўропе. Замежная палітыка Румыніі ставіць сабе мэтаю захаваньне добрых дачыненьняў з усімі суседнімі дзяржавамі, умацаваньне саюзу з краінамі Малой Антанты і з Польшчаю; зацікаўленасьць гэтых краёў з пункту гледжаньня захаваньня спакою і парадку супадае з румынскаю. Румынія імкнецца замацаваць саюз з Францыяй, Італіяй і асабліва з Англіяй, якая спрыяла ажыцьцяўленьню нацыянальнага адзінства Румыніі. У гэтым сэнсе інтарэсы Румыніі супадаюць з інтарэсамі Англіі і з гэтае прычыны адною з галоўных мэтаў замежнай палітыкі зьяўляецца паглыбленьне саюзу з Англіяй.

Вынікі выбараў у румынскі сэнат.

ВЕНА, 12-VII. Выбары ў румынскі сэнат, якія адбыліся ў нядзелю, скончыліся такімі вынікамі: лібэралы атрымалі 96 мандатаў, нацыянальна-сялянская партыя—17 і нямецка-вэнгэрскі блёк—2.

* *

ВЕНА, 8-VII. Згодна няпоўных данных аб румынскіх выбарах, лібэралы атрымалі па ўсім краі 60-70 проц. з ліку паданых галасоў, ці каля 290 мандатаў. Нацыянальная сялянская партыя атрымала 20-25 проц. галасоў, ці каля 70 мандатаў. Блёк нацыянальных меншасьцяў, па чутках, меў посьпех у некаторых акругах. Пакуль што невядома, **ці сабралі рабоча-сялянскі блёк і сацыял-дэмакраты 2 проц.** ад агульнай колькасьці пададзеных галасоў, неабходнае для атрыманьня 1 мандата.

ЧАН-КАЙ-ШЫ „ВЫРАШАЕ" УХАНСКАЕ ПЫТАНЬНЕ.

РУХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН ПРОЦІЎ НАНКІНСКАГА ЎРАДУ.

Проці камуністаў і трох прынцыпаў Сун-Ят-Сэна.

ПЕКІН, 12-VII. Згодна паведамленьняў газэт, Чан-Кай-Шы, раней чымся распачаць наступ на Цнань-Ханькоўскай чыгунцы, хоча вырашыць уханскае пытаньне. Агэнцтва Чжун-Мін зьмяшчае тэкст тэлеграмы Чан-Кай-Шы да Фынь-Юй-Сяна. Чан-Кай-Шы выказвае ўдзячнасьць Фынь-Юй-Сяну за дапамогу і падкрэсьлівае неабходнасьць «сеяць варожасьць проці камуністаў і проці трох прынцыпаў Сун-Ят-Сэна».

«Дзеля гэтых ідэалаў,—зазначана ў тэлеграме,—я паслаў сваё войска на захад, каб распачаць генэральны наступ проці камуністаў. Зараз я чакаю вашых інструкцый».

Чуткі аб падрыхтоўцы Чан-Кай-Шы да наступу на Ухан пацьвярджаюцца тэлеграмаю японскага агэнцтва «Тоха» ад 10 ліпеня з Шанхаю. У гэтай тэлеграме зазначана, што Чан Кай-Шы думае ў бліжэйшым часе пасласць у раён Лючжэна першую армію ўзятую нядаўна з шаньдуньскага фронту.

Выключэньне з партыі лідэраў левага Гаміндану.

ШАНХАЙ, 12-VII. Выканаўчы камітэт і кантрольная камісія кантонскай арганізацыі Гаміндану выключыла з партыі лідэраў левага Гаміндану: Сун-Фо (сын Сун-Ят-Сэна) і Ван-Цін-Вэя.

Рух процiў нанкінскага ўраду.

Сяляне вызвалілі арыштаваных.

ШАНХАЙ, 12-VII. Згодна паведамленьня, больш тысячы сялян напала на гарадзкую ўправу ў Ямене і вызвалілі 200 чалавек, арыштаваных за выступленьне проці нанкінскага ўраду. Гарадзкі галава ўцёк.

Моладзь уцякае з нанкінскага войска.

ПЕКІН, 12-VII. Паведамляюць, што за апошні час шмат моладзі ўцякае з нанкінскай арміі ў Ханькоу. Водлуг слоў газэт якраз гэта зьявішча паслужыла прычынаю адступленьня арміі Чан-Кай-Шы на фронце ў раёне Цянь-Цзінь-Пукоўскай чыгункі. Весткі аб руху юнага войска з раёну Цянь-Цзінь-Пукоўскай чыгункі ў напрамку на Пукоу пацьвярджаюцца.

Паўстаньне ў Тайсіне.

ШАНХАЙ, 12-VII. У Тайсіне (правінцыя Цянь-Су) выбухнула сур'ёзнае паўстаньне проці Нанкіну. Начальнік паліцыі, на чале паліцэйскіх і рабочых зрабіў вобыск у мясцовым камітэце Гаміндану (правага) і арыштаваў старшыню нанкінскае арганізацыі Гаміндану.

Войска Фынь-Юй-Сяна перайшло раку Жоўтую.

ШАНХАЙ, 12-VII. Ангельскі друк паведамляе, што Фынь-Юй-сян перайшоў рэчку Жоўтую каля Лейяну і Кайфыню. Водлуг слоў газэты, войска Фынь-Юй-сяна пасунулася ў бок Баокінскай чыгункі.

Чуткі аб паражэньні нанкінскай арміі.

ШАНХАЙ, 12-VII. З розных крыніц распаўсюджваюцца весткі, што паўночнае войска ня толькі абвясьціла паўстаньне ў Кяо-Чао і Цындао, але таксама нанесла некалькі паражэньняў нанкінскай арміі і 9-га захапіла назад Сючжоў. Далей агэнцтва паведамляе, што Чжан-Цзо-Лін спыніў «далейшы наступ на поўдзень» з «мэтаю замацаваць перамогу» і перагрупаваць войска. Чыгуначныя зносіны па лініі Сло-Чао Хэнань аднавіліся.

Згода між Чжан-Цзун-чанам і ген. Сямёнавым.

ШАНХАЙ, 12-VI. Паведамляюць, што між Чжан-Цзун-чанам і белагвардзейскім генэралам Сямёнавым утворана згода, водлуг якой апошні абавязваецца сабраць атрад у 5.000 белагвардзейцаў для ўдзелу ў ваенных дзеяньнях шандуньскай арміі. Сямёнаў знаходзіцца ў Шанхаі, дзе вярбуе белагвардзейцаў.

Справа 15-ці савецкіх грамадзян.

ПЕКІН, 12-VII. Сёньня адбылося другое пасяджэньне суду папярэдняга разгляду справы 15-ці савецкіх грамадзян, арыштаваных у часе наскоку на памяшканьне пекінскага паўнамоцнага прадстаўніцтва. Сёнешняе пасяджэньне было прысьвечана допросу 5-ці абвінавачаных. У гэтай стадыі разгляду справы пракурор ня ўдзельнічае. Чарговае пасяджэньне, як відаць, адбудзецца на тым тыдні.

БАРАДЗІНА І ДЫПЛЁМАТЫЧНЫЯ КУР'ЕРЫ ВЫЗВАЛЕНЫ.

ПЕКІН, 12-VII. Суд ухваліў пастанову аб вызваленьні Бародзінай і 3-х дыплёматычных кур'ераў. Сёньня яны вызвалены.

Становішча ў Шандуні.

ПЕКІН, 12-VII. Увага чужаземнага друку ў працягу ўсяго апошняга тыдню згуртавана на правінцыі Шандунь. Асаблівая ўвага аддаецца дзеяньням Японіі і выступленьню генэрала Чау-І-Жэна.

«Норд Чайна Стандарт» у артыкуле „Шандуньскі калідор" наконт выступленьня Чау-і-Жэна піша: „Ранейшы падначалены Сун-Чуан-фана, як відаць, прыслухоўваецца да голасу Чан-Кай-Шы. Для таго каб выйграць час, ён перарваў зносіны на шандуньскай чыгунцы. Але Японія мае аблігацыі гэтай чыгункі і калі шандуньская чыгунка апыніцца пад пагрозаю збоку якой-небудзь вайсковай групоўкі, дык зацікаўленыя ў захаваньні гэтай лініі ўжывуць захады проці парушэньня дзейнасьці гэтай чыгункі».

Водлуг вестак „Манчжурыя Дэйлі Ньюс", у Цындао абвешчана асаднае становішча, вулічны рух забаронен пасьля 10-й гадзіны ўвечары. Выключэньне даецца толькі японскім грамадзянам, якія маюць пропускі ад японскага консульства. На рэйдзе ў Цындоу ў сучасны момант знаходзяцца больш 20 японскіх, ангельскіх і амэрыканскіх вайсковых суднаў.

Японскае войска ў Цынаньфу.

ШАНХАЙ, 11-7. У Цынаньфу (рэзыдэнцыя Чан-Цзун-Чана) прыехала 1500 японскіх салдат, якія перакінуты з Цындао.

Курс уханскіх грошай павысіўся.

ХАНЬКОУ, 11-7. За апошнія дні курс уханскіх грошай значна павысіўся.

ТЭЛЕГРАМА СТАРШЫНІ ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОВА

НА ІМЯ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

«Вітаю ў асобе Гарсавету рабочых і сялян Беларусі з гадавінай вызваленьня Менску ад белапалякаў. У сучасны складаны момант міжнародных адносін згуртуем шчыльней рады рабочых і сялян, умацуем кіраўніцтва кампартыі, узмоцнім Чырвоную армію, будзем прадаўжаць сацыялістычнае будаўніцтва, каб быць гатовымі адбіць напад ворагаў. Чырвоны Менск, будзь гатоў!»

Чыгуначнікі дапамогуць будаваць Асінастрой.

(Тэлеграма на імя ЦВК і СНК БССР з Бранску).

У дзень урачыстага адчыненьня работ на Асінастрої праўленьне МББ чыгункі прыслала на імя ЦВК і СНК БССР тэлеграму наступнага зьместу:

«Дзень адчыненьня Асінастрою—першы буйны крок да электрафікацыі Беларусі—значна ўзмоцніць індустрыялізацыю краіны. Праўленьне МББ чыгункі вітае ЦВК і СНК БССР і завярае ў тым, што чыгуначны транспарт і чыгуначнікі заўсёды гатовы дапамагчы будаваць Асінастрой».

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

3-яя сялянская выйгрышная пазыка.

Адзін выйгрыш на 7 аблігацыяў.

МАСКВА. У бліжэйшыя дні Наркамфін СССР распачынае рэалізаваць 3-ю сялянскую выйгрышную пазыку для павялічэньня сродкаў для сельскай гаспадаркі. Пазыка выпушчаецца на суму ў 25.000 000 руб. тэрмінам на 3 гады з 1-га красавіка г. г. да 1-га красавіка 1930 году. Выгада пазыкі значна большая ад усіх папярэдніх пазык, у сярэднім яна дае 6 проц. па купонах і 11 проц. па выйгрышах, г. зн. 17 проц. у той час, як іншыя пазыкі даюць 13-14 проц.

Наркамфін СССР ужывае ўсе захады, каб новая пазыка пасунулася ў масы сялянскага жыхарства. Для гэтага Наркамфін СССР утварыў умову з Цэнтральным сельска-гаспадарчым банкам аб рэалізацыі гэтай пазыкі праз яго крэдытную сыстэму.

Арганізоўваецца растлумачэньне мэты пазыкі сярод часьцей Чырвонай арміі. Пры 5 млн. 5-ці рублёвых аблігацый у сярэднім даводзіцца **1 выйгрыш на кожныя 7 аблігацый.**

Продаж аблігацый пазыкі будзе рабіцца па звычайнай раскладцы, але палова кошту аблігацый можа быць выплачана сялянскім паямі па таварыствах сельска-гаспадарчага крэдыту.

Першы тыраж выйгрышаў новай пазыкі мае адбыцца 15-га сьнежня. У гэты тыраж будзе разыграна 175.161 выйгрышаў на суму 1.875.000 руб. У ліку выйгрышаў ёсьць 1 выйгрыш у 5 тысяч руб., 10 выйгрышаў—па 2 тыс. руб., 50 выйгрышаў па 1 тысячы руб., 100 выйгрышаў па 500 руб. і 175 тысяч па 10 руб.

Восьмы выпуск вайскова-палітычнай Акадэміі.

ЛЕНІНГРАД. Адбыўся ўрачысты выпуск вайскова-палітычнай Акадэміі. Усяго было выпушчана 159 палітпрацаўнікоў. На ўрачыстасьці з вялікаю прамоваю выступіў т. Бубноў, які заклікаў да павялічанай увагі абароне.

Конкурс на лепшых вясковых стралкоў.

МАСКВА, 12-7. ТДА-Авіяхіму разам з газэтамі «На страже» і «Крестьянской Газетой» абвяшчае конкурс на лепшых вясковых стралкоў, які павінен скончыцца сёлета ўвосень. Мэта конкурсу—выявіць лепшых сялянскіх стралкоў і, апроч таго, ажывіць працу стралковых гурткоў у вёсцы, а таксама спрыяць распаўсюджаньню стралковага спорту ў Крыме.

Зборы на самалёты.

ХАРКАЎ, 12-VII. На эскадрыльлю «Разрыў» штодзённа ўносіцца 20-25 тыс. руб. Можна чакаць, што на эскадрыльлю «Разрыў» будзе сабрана больш 1 млн. руб.

РАСТОЎ-ДОН. Па 18 акругах краю на эскадрыльлю **«Наш адказ Чэмбэрлену»** сабрана больш 92 тысяч руб.

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў.

Галоўпалітасьветы прапануе аддзелам палітасьветы ўжыць усе захады да поўнага зьнішчэньня няпісьменнасьці сярод дапрызыўнікаў. У аснову пляну працы на 1927-28 год павінна быць пакладзена задача пагалоўнага навучаньня пісьменнасьці няпісьменных дапрызыўнікаў народжаных у 1906, 1907 і 1908 г. г., а таксама ўсіх няпісьменных пераменнікаў і па-за вайсковых асоб. Апроч таго, павінны быць навучаны пісьменнасьці да моманту прызыву дапрызыўнікі, народжаныя ў 1905 годзе.

Рост нашае гаспадаркі.

МАСКВА, 12-VII. Водлуг даных ЦСУ СССР у першыя паўгодкі сёлетняга году ў народную гаспадарку ўлілося больш паловы мільёну новых рабочых. Лік прагулаў значна зьменшыўся. Заработак павялічыўся ў параўнаньні з другімі паўгодкамі леташняга году на 4,4 проц.

Курсы першай дапамогі пры атруце газамі.

ПЯЦІГОРСК. Асацыяцыя дактароў у Пяцігорску, Кіславодзку і Эсэнтуках арганізавала курсы першай дапамогі пры атруце газамі.

У Польшчы.

ПОСЬПЕХ ЛЕВЫХ НА КАМУНАЛЬНЫХ ВЫБАРАХ.

ВАРШАВА, 12-VII. Камунальныя выбары ў Згержы скончыліся такімі вынікамі: за скасаваны ўладай сьпіс рабочай лявіцы было пададзена 2.290 галасоў, за сьпіс ППС 961.

Закон аб выбарах у мясцовыя рады.

Польскі сойм прыступіў да разгляду закону аб выбарах у валасныя рады. З боку беларусаў выказана думка, што новы закон зьяўляецца куды горшым, чым той, які быў выдан калісьці генэральным камісарам Усходніх зямель.

Завод самалётаў аднавіў працу.

ВАРШАВА, 12-VII. Аднавілася праца на заводзе самалётаў, які быў зачынены за адсутнасьцю заказаў. Завод працуе з поўнаю нагрузкай.

Чыгуначная катастрофа.

Паміж станцыямі Гожухава-Доўбава зышоў з рэек таварны поезд. Зваліліся 12 вагонаў 2 кандуктары паранены.

Катастрофа з аэрапланам.

5 ліпеня г. г. на аэрадроме ў Варшаве ўпаў вайсковы самалёт. У мэханіка Шыліна паламаны ногі. Самалёт разьбіўся ўшчэнт.

У Заходняй Беларусі.

«Выбары» у нац. бел. камітэт.

Мы ўжо пісалі аб тым, што ў Вільні «выбран» новы бел. нац. камітэт, у склад якога ўвайшлі пасол Ярэміч, сэнатар Баргановіч і інш. Як аказваецца гэтыя «выбары» адбыліся бяз ведама існуючага прэзыдыуму нац. бел. камітэту і зьяўляюцца самазванымі.

Ініцыятыва выбараў, згодна са статутам, належыць або прэзыдыуму к-ту, або групе сяброў у паразуменьні з прэзыдыумам. Гэтага апошняга ня было. Ня было нават і папярэджаньня аб скліканьні сходу. Значыць, «выбары» зьяўляюцца падлогам і носяць характар і рысы злачынства.

Выбары ў гмінныя рады.

Як сьцьвярджае «Kurjer Wilenski» беларускае сялянства на выбарах у рады здабыла 80 проц. усяе лічбы мандатаў.

За кандыдатаў на радных выстаўляліся пераважна асобы паважныя, якія цікавіліся грамадзкім жыцьцём. Многа прайшло людзей з сярэдняй, а то і з вышэйшай асьветай.

У Слонімскім павеце выбрана ў гмінныя рады 66 сялян (беларусаў), 7 асаднікаў, 3 настаўнікі, 3 абшарнікі і 2 урадоўцы.

Водгукі „каранацыі".

«Каранацыя» Вострабрамскага абразу знайшла моцны водгук у літоўскім друку. «Vilnias Aidas», пішучы аб каранацыі ў артыкуле «З вялікай хмары малы дождж», падкрэсьлівае, што ўласна гэта ўрачыстасьць была зроблена больш для паліцыі, жандармэрыі, войска і важных урадоўцаў, у той час калі фактычныя багамольцы былі адпіхнуты далёка ад месц урачыстасьці ў завулкі, дзе цэлы дзень сталі па дажджы. Польскі «Kurjer Wilenski», абгаворваючы павышшы артыкул, сьцьвярджае, што аўтар мае поўную слушнасьць у сваіх разважаньнях.

Танны хлеб.

Чакаючы вялікага напльну багамольцаў у часе «каранацыі» Вострабрамскага абразу, прывезена было з Варшавы 3 вагоны жытняй мукі. Аднак, мука гэта аказалася непатрэбнай з прычыны малай лічбы багамольцаў, якіх чакалі з усіх бакоў, але якія чамусь не зьявіліся. Цяпер з гэтай мукі выпякаецца хлеб і прадаецца на 5 гр. танней звычайнай цаны.

Зьмена граніц.

Адбылася некаторая зьмена граніц Віленскага ваяводзтва на карысьць Навагрудзкага ваяводзтва. Канеўская гміна адышла да Навагрудзкага ваяводзтва.

У кулацкай Літве.

Аб шыльдах.

«Idische Stimme» піша, што 4-га ліпеня літоўская паліцыя загадала ўласьнікам некаторых яўрэйскіх склепаў зьняць з магазынаў шыльды з яўрэйскімі надпісамі.

Фашыстаўская ахранка.

Да апошняга часу рух у Коўні быў забаронены ад 12 гадз. ночы да 6 гадзіны раніцы. «Idische Stimme» паведамляе, што бліжэйшымі днямі хаджэньне па Коўні будзе забаронена толькі паміж 1-4 гадзінамі.

Парцэляцыя маёнткаў.

Па статыстычных даных Дэпартаманту земляробства ў 1916 г. распарцэлёвана 98.916 гэктараў абшарніцкіх зямель. З іх утворана 9.032 гаспадаркі.

СУПРОЦЬНЯМЕЦКІЯ ВЫБРЫКІ.

Клайпэдзкі дырэктар выслаў 7 нямецкіх настаўнікаў з абшару Клайпэды. У апошнім паўгодзьдзі выдалена агулам 34 нямецкія настаўнікі. Гэтым спосабам літоўскі ўрад пазбываецца непажаданых нямецкіх элемэнтаў.

БАЛІЦКІ.

Нацыяналістычны ўхіл у КП(б)У.

У газэце «Праўда» ад 5-га ліпеня гэтага году агалошана інфармацыйнае паведамленьне аб заяве ЦК КП(б)У у Выканаўчы Камітэт Камуністычнага Інтэрнацыяналу наконт рознагалосьсяў, якія ўзьняліся ў нязначнай групы сяброў КП[б]У на чале з т. Шумскім з лініяй партыі пры правядзеньні нацыянальнай палітыкі. Супярэчнасьці тав. Шумскага, ня маючы ніякай падтрымкі сярод сяброў партыі на Украіне, знайшлі водгук, дзякуючы недастатковай і няправільнай інфармацыі ў частцы партыйцаў, працуючых у Заходняй Украіне пад Польшчай, і пытаньне гэта становіцца прадметам абгаварэньня Выканкому Камінтэрну. Для Беларусі, якая ў сваім нацыянальным і культурным разьвіцьці мае вельмі многа супольнага з Украінай, пытаньне аб рознагалосьсях групы сяброў КП[б]У супроць лініі ЦК КП[б]У набывае асаблівае значэньне.

У чым сутнасьць супярэчнасьцяў, аб якіх будзе гаварыць Выканком Камінтэрну?

Сацыяльныя карэньні і праявы шавінізму на Украіне.

Яшчэ чэрвенскі пленум 1926 году ЦК КП[б] У у сваіх тэзісах аб выніках украінізацыі, адзначыў, што „развитие нэпа, рост капиталистических элементов как в городе, так и в селе, означает рост буржуазии и обострение национальной борьбы в ее среде. Такое обострение неизбежно связано с ростом шовинизма как русского, так и украинского [а также еврейского и др.]. Рост шовинизма в среде развивающейся буржуазии оказывает несомненное влияние на крестьянские, а также, конечно в белее слабой степени, и на рабочие массы. Все это находит свое отражение и на настроениях внутри партии, тысячами нитей связанной с окружающей социальной средой. Те политические трудности, которые вытекают из хозяйственного роста страны в условиях нэпа [дифференциация села, аграрное перенаселение, усиление кулачества и частного капитала] все это на Украине осложняется национальным вопросом". [Старонка „8" «Об итогах украинизации. Тезисы Пленума ЦК КП[б]У—издание Белгосиздата, Минск 1926 г.].

Расьце шавінізм сярод буржуазеі, перадаецца сялянству і нават рабочым, адбіваецца на настроях паасобных партыйцаў. Сацыяльныя карэньні расейскага шавінізму на Украіне знаходзяцца ў гарадзкім мяшчанстве і ў інтэлігенцка-спэцаўскай праслойцы. Праявы расейскага шавінізму выяўляюцца ў размовах наконт праваходзтва расейскай культуры над украінскай, у ня зусім яшчэ зьліквідаваных поглядах на украінскую мову, як на „нарэчча" адзінай расейскай мовы, у распаўсюджаным у дзе-якіх колах, нават сярод партыйцаў, нацыянальным нігілізьме, які зьяўляецца ў пренебражыцельных адносінах да нацыянальнага пытаньня пад сьцягам прыхільнасьці да чыстага «інтэрнацыяналізму». Расейскі шавінізм мае падтрымку ў масах расейскага мяшчанства па-за межамі Украіны. Тав. Шумскі ў сваім артыкуле, надрукаваным у „Більшовіку України" № 2 1927 г. прыводзіць факты, як з аднаго боку расейскі нацыянальны мяшчанін з Ленінграду ў «Жизни Искусства» падымае гвалт на ўвесь Саюз, што ў «Харьковском центре»—заселі шавіністы і па іх наказу „русская опера в Одессе должна играть помалорусски», і з другога боку, як нейкі Яструбецкі з Кіеву пабег плакаць на старонках „Труда", што «подавляющему большинству трудящихся Киева чужд украинский язык", „украинизация для масс или массы для украинизации»? Гэткіх фактаў напоўна можна набраць шмат. Але камуністычная партыя Украіны паслядоўна вядзе і будзе весьці рашучую барацьбу з праявамі расейскага шавінізму, праводзячы правільна ленінскую нацыянальную палітыку

Сацыяльныя карэньні ўкраінскага шавінізму ідуць ад кулацтва і зьвязанай з ім інтэлігенцыі на вёсцы і ўкраінскай дробнай буржуазеі, інтэлігенцыі і ўкраінізаваўшыхся спэцаў, і савецкіх працаўнікоў—у гарадох. У тэзісах чэрвенскага 1926 г. пленуму ЦК КП[б]У, дзе робіцца аналіз украінскаму шавінізму сказана: «Решительно борясь с пережитком русского шовинизма, являющегося главным препятствием на пути к разрешению национального вопроса, партия одновремечно должна вести борьбу и против украинского шовинизма. Этот шовинизм бесспорно растет в деревне за счет кулачества и связанной с ним части сельской интеллигенции. Все еще недостаточно удовлетворительное положение основных групп сельской интеллигенции (учителей, агрономов, врачей) само собою разумеется, только благоприятствует усилению кулацкого влияния на них. Точно также несомненно, что это влияние кулачества будет оказывать и на другие слои крестьянства.

Украинский шовинизм растет также и в городе за счет пока еще малочисленной, но еще усиливающейся выходящими из села украинской мелкой буржуазии и интеллигенции, а также спецов и служащих украинизирующегося совапарата, связь которого с украинской мелкой буржуазией усиливается. Усиливающаяся украинская мелкая буржуазия будет чем дальше, тем больше, пытаться оказывать влияние на пролетариат и даже на нашу партию».

(Стр. 10—Об итогах украинизации—тезисы ЦК КП(б)У; издание Белгосиздата, Минск, 1926 г.

Праявы украінскага шавінізму выяўляюцца ў шмат якіх фактах і падзеях, якія адбываюцца на Украіне. Той-жа самы т. Шумскі ў № 2 „Більшовіка України" за 1927 г. прыводзіць вельмі характэрныя факты з жыцьця ўкраінскай інтэлігенцыі. Калі адна выдатнейшая расейская артыстка запрапанавала сваю працу на сцэне аднаго з украінскіх тэатраў, ня ведаючы украінскай мовы, дык ёй прапанавалі ў тэатры выступаць на італьянскай мове, каб толькі не на расейскай; акадэмік Грушэўскі па поваду пяцідзесяцігодзьдзя царскага акту 1876 году, які задушыў украінскую культуру, зрабіў прамову, дзе адзначыў, што акт гэты 1876 году пахаваны рэвалюцыяй 1905 году, але гэты «затоплений дзвін» прадаўжае гудзець з падзямельля, і што ён, акадэмік Грушэўскі, змагаўся з водгукам гэтага «затопленага дзвіна»; і зараз ён, акадэмік Грушэўскі, чуе гэты „дзвін" нават з трыбуны нашага рабоча-сялянскага парляманту—Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу, дзе раздаюцца галасы, каб «закріпити на вічні часи те підрядне становище, на яке звелі українську культуру царські заборони». Усе гэтыя факты настолькі відавочны, што дабавіць да іх няма чаго.

Тэорыя барацьбы дзьвёх культур.

Водгукам на рост шавінізму сярод буржуазеі і буржуазнай інтэлігенцыі паявілася на Украіне не марксыцкая і ня ленінская тэорыя «барацьбы дзьвёх культур»—украінскай і расейскай. Гэта тэорыя мела сваіх прыхільнікаў і абаронцаў сярод партыі, як і расейскай яе мадыфікацыі, так і украінскай, ня гледзячы на зусім ясныя па гэтаму пытаньню ўказаньні Ул. І. Леніна. У сваім артыкуле «Националистический жупел ассимиляторства» Ул. І. Ленін, супярэчачы Льву Юркевічу, кажа:

«Наконец в необычненно богатом националистическими перлами рассуждении г. Юркевича надо отметить еще следующее. Меньшинство украинских рабочих—национально сознательно, говорит он—большинство находится еще под влиянием русской культуры".

„Когда речь идет о пролетариате, это противопоставление украинской культуры в целом, великорусской культуре тоже в целом, означает самое безстыдное предательство интересов пролетариата в пользу буржуазного национализма". (Соч. Ленина т. XIX, стр. 50). Гэта тэорыя «барацьбы двох культур пры нэйтралітэце партыі і савецкай улады (альбо нават пры садзейнічаньні няміучаму працэсу русіфікацыі), зьявілася на Украіне ў часы нямецкай акупацыі, калі КП(б)У прызнала задачу будаўніцтва Украіны, як асобнай савецкай дзяржавы. Паявіўшыся ў расейскай яе мадыфікацыі, яна была асуджана катэгарычна XII зьездам партыі; КП(б)У ўступіла на шлях актыўнай украінізацыі. Ня гледзячы на гэтым зусім ясныя ўказаньні XII зьезду тэорыя барацьбы двух культур у 1926 годзе зноў паявілася на Украіне, але ўжо, галоўным чынам, у яе украінскай модыфікацыі. У часы літаратурнай дыскусіі, якая адбывалася на Украіне перад чэрвеньскім 1926 году пленумам ЦК КП(б)У, гэта тэорыя выразна вызначылася ў выступленьнях украінскага пісьменьніка т. Хвільявога у выст. к-та ЦК КП(б)У т. Максімовіча і ў выступленьнях т. Шумскага, які браў іх пад сваю абарону. Тав. Хвільевой у часы дыскусіі выкінуў не марксыцкі, ня ленінскі, няправільны і цалкам няпралетарскі лёзунг «Від Масквы—на Захід». Гэты лёзунг, хоць ён датычыць пакуль што пытаньняў літаратуры і культуры, зьяўляецца небясьпечным для пралетарыяту; т. Хвільевой і тыя, што ідуць разам з ім, выкінуўшы гэты лёзунг, сходзяць з правільных пралетарскіх пазіцый і ўступаюць на шлях адзінага нацыянальнага фронту. «Такія лёзунгі», гаворыцца ў тэзісах чэрвеньскага пленуму ЦК КП(б)У 1926 г. «могут только служить знаменем для растущей на почве нэпа украинской мелкой буржуазии, которая возрождение нации понимает, как буржуазную реставрацию, а под ориентацией на Европу капиталистическую—отмежевание от цитадели международной революции, столицы СССР—Москвы». (Об итогах украинизации — тезисы пленума ЦК КП(б)У—издание Белгосиздата, Минск 1926 г. стр. 11).

Цэлая літаратурная група, так званых «нэоклясыкаў» разам з часткай вышэйшай інтэлігенцыі сваю працу накіроўвае на задаваленьне патрэб украінскай буржуазеі; яна (група] хоча накіраваць эканоміку Украіны па капіталістычным шляху, адарваць яе ад эканомікі іншых саюзных рэспублік, трымае курс на сувязь з буржуазнай Эўропай і выступленьне т. Хвільевога са сваім лёзунгам у культурным жыцьці „Від Масквы на захід", зьяўляецца тым памостам, праз які ўкраінская буржуазея перакідае свой ідэалёгічны ўплыў на нястойкіх сяброў нашай партыі. Вось чаму і чэрвеньскі пленум ЦК КП(б)У 1926 г. і заява ЦК КП(б)У ў Выканком Камінтэрну ня толькі катэгарычна асуджае гэтае выкрыўленьне пралетарскай ідэалёгіі, але і б'е небясьпеку на гэтым пытаньні.

Шляхі украінскай культуры.

У культурных адносінах ЦК КП(б)У стаіць за самастойнае разьвіцьцё украінскай культуры, за выяўленьне ўсіх творчых сіл украінскага народу.

„Путем буржуазного развития мы противопоставляем наш пролетарский путь. Партия стоит за самостоятельное развитие украинской культуры, за выявление всех творческих сил украинского народа. Партия стоит за широкое использование строющейся украинской социалистической культурой всех ценностей мировой культуры, за решительный ее разрыв с традициями провинциальной ограниченности и рабского подражания, за создание новых культурных ценностей, достойных творчества великого класса, но партия это делает не путем противопоставления украинской культурам других народов, а путем братского сотрудничества рабочих и трудящихся масс всех национальностей в деле строительства международной пролетарской культуры, в которую украинский рабочий класс сумеет вложить свою долю".

(Тыя-ж тэзісы ЦК КП(б)У стр. 12).

Адхіліўшы і асудзіўшы, як шкадлівы погляд адмежаваньня украінскай культуры ад культуры расейскай, партыя прызнае супрацоўніцтва ўсіх працуючых мас, усіх нацыянальнасьцяў і ў першую чаргу рабочых над будаваньнем паміжнароднай пралетарскай культуры, дзе украінскі пралетарыят уложыць сваю лепту гэтак сама, як і пралетарыят іншых краін. Масква—сэрца пралетарыяту, якая стварыла і стварае культурныя пралетарскія здабыцьці, ня можа стаяць у баку ад гэтага супрацоўніцтва, гэтак сама, як ня могуць стаяць у баку Беларусія, Грузія і іншыя народы пастолькі, паскольку яны прымаюць удзел у стварэньні пралетарскай культуры. Культурныя дасягненьні пралетарыяту і працоўных усіх народаў і ў першую чаргу народаў СССР зьяўляюцца агульным багацьцем паміжнароднай пралетарскай культуры і ў братэрскім супрацоўніцтве ідуць на агульнае выраўніваньне культурных багацьцяў, на будаваньне сацыялізму. Але ў гэтым супрацоўніцтве ня можа быць гэгемоніі якой-небудзь культуры адной нацыянальнасьці ў сэнсе кіраўніцтва, альбо [illegible] над культурай другой нацыянальнасьці. КП(б)У стаіць за самастойнае разьвіцьцё украінскай культуры, яна верыць у моц пралетарыяту Украіны, у яго творчыя сілы.

Украінская культура ня можа быць другараднаю культураю, партыя—за рашучы разрыў з традыцыямі правінцыяльнай абмяжаванасьці і рабскага падражаньня; шлях украінскай культуры—гэта шлях стварэньня новых культурных каштоўнасьцяў.

Сутнасьць нацыяналістычнага ўхілу ў КП(б)У.

Так адбывалася на Украіне барацьба за чыстату пралетарскай ідэалёгіі; гэтая барацьба не праходзіла бяз удзелу партыі. У сваіх пастановах на ўсе спрэчныя пытаньні партыя дае ясныя і выразныя адказы, але ня гледзячы на гэта, частка сяброў партыі на чале з тав. Шумскім, узялі няправільную лінію; лінію, якая зьяўляецца нацыяналістычным ухілам у КП(б)У. Гэты нацыяналістычны ухіл зьяўляецца адбіткам у партыі складаючайся ідэалёгіі ўкраінскай буржуазеі, якая, як гаворыцца ў заяве ЦК КП(б)У «трымае курс на рэстаўрацыю буржуазнай Украіны пад гегемоніяй узрастаючай гарадзкой буржуазеі у цесным блёку з кулацтвам пры падтрымцы міжнароднага імпэрыялізму». Гэты нацыяналістычны ухіл ужо яскрава намеціўся ў часы памятнай літаратурнай дыскусіі і ня зьнішчыўся пасьля адпаведных пастаноў партыі па гэтым пытаньні. У нумары другім «Більшовіка України» за 1927 г. надрукован артыкул т. Шумскага „Ідэолёгічна боротьба в українському культурному процесі», які зьяўляецца адбіткам прамовы т. Шумского 25 лістапада 1926 году на сходзе працаўнікоў-камуністых Наркамасьветы; у гэтым жа нумары надрукован і артыкул т. Скрыпніка «Хвильовизм чи шумськизм", які зьяўляецца адказам на артыкул т. Шумскага і з якім рэдакцыя „Більшовика" цалкам згаджаецца. З артыкулаў т. Шумскага і т. Скрыпніка мы бачым, што т. Шумскі фактычна падзяляў погляд т. Хвільевога і затушоўвае яго памылкі нават пасьля пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК КП(б)У. Артыкул т. Скрыпніка дае шмат матар'ялу, каб у гэтым упэўніцца. Прывядзем некаторыя фактычныя дадзеныя, якія дае ў сваім артыкуле т. Скрыпнік. 12 траўня 1926 году ў сваёй прамове т. Шумскі заявіў:

„Мне ставится вопрос: согласен ли я с этим путем развития украинской литературы и, в частности, с той ориентацией, какую дает т. Хвильевой в своем разделе „Московські задрипанки"? Согласен я с основной мыслью т. Хвильевого о том, какими путями должна развиваться украинская литература и каким материалом она должна питаться. Но не согласен я с той формой, в какую облекает т. Хвильевой эту правильную мысль в своем разделе „Московські задрипанки" и с его утрированными и острыми формулировками".

На пленуме ЦК КП[б]У ад 5-га чэрвеня 1926 году т. Шумскі заявіў:

„Хвільевой свае правільныя меркаваньні пра арыентацыю на Захад у тым разуменьні, як я гэта гаварыў 12 траўня, сфармуляваў і напісаў так, што іх можна сапраўды зразумець так, як гэта і зразумелі некаторыя таварышы".

Такім чынам мы бачым, што з асноўнымі думкамі т. Хвільевога т. Шумскі згодзен, ён толькі супроць вострых формулёвак. І зусім правільны робіць вывад т. Скрыпнік, які супярэчачы т. Шумскаму кажа:

«Не, т. Шумскі, самае галоўнае ў выступленьні т. Хвільевого ня тое, як ён сказаў і як яго зразумелі, а тое, што ён сказаў. А тое, што ён сказаў і з чым вы згодны,—гэта няправільная, некамуністычная думка, гэта некамуністычны ўхіл, гэта прыбліжэньне да пераходу на шлях адзінага нацыяналістычнага фронту".

(Вытрымкі ўзяты з арт. т. Скрыпніка „Більшовік Укр." № 2-1927 г. ст. 33 і 34).

Т. Шумскі на словах адмаўляючы барацьбу дзьвёх культур фактычна яе прызнае, становячыся на пазіцыю т. Хвільевога. У тым жа артыкуле т. Скрыпніка ёсьць дакумэнтальныя доказы гэтай пазіцыі т. Шумскага.

І пасьля гэтага зусім становіцца зразумелай заява ЦК КП[б]У у Выканком Камінтэрну, якая фармулюе сутнасьць нацыяналістычнага ухілу ў КП(б)У. Зьбіваючыся на шлях адзінай нацыяналістычнай платформы праз асуджаную партыяй тэорыю барацьбы дзьвёх культур, праз арыентацыю хоць бы культурную на капіталістычны Захад, можна дайсьці да аслабленай траўлі украінскіх таварышоў, якія праводзяць правільна камуністычную лінію, да ўяўленьня партыі, як насіцельніцы расейскага шавінізму, да недавер'я да таварышоў—камуністаў толькі за тым, што яны ня украінцы, да ўпадачных настрояў у адносінах да пэрспэктыў сац. будаўніцтва, да навер'я ў здольнасьці партыі праводзіць нацыянальную палітыку, да запатрабаваньняў сілкам украінізаваць рабочых не украінскай нацыянальнасьці, да недацэнкі ролі партыі і рабочай клясы ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня.

Партыя зможа даць адпор нацыяналістычным ухілам гэтак сама, як яна дае адпор усякім іншым ухілам у партыі.

Партыя праводзіць і будзе праводзіць правільную ленінскую палітыку.

Лінейная калібровочная мішэнь LRT-BE4-V2

Табліца выйгрышаў

1-ай Усебеларускай Грашовай Лётарэі Дапамогі Бяспрытульным Дзецям.

12-га ліпеня 1927 г.

Выйгрышы па 5 рублёў:

1097	43450	91201	138410	179991	228476
1709	44463	91947	138609	182340	229780
2013	45773	92811	141094	187615	230210
2180	46817	94466	141099	187786	230331
4108	47100	95136	142278	187993	231042
4324	47305	97713	144188	188764	232747
4714	49330	98170	146217	189106	234203
4870	49839	98964	151547	189906	236371
12748	52341	99175	151700	190106	237345
16076	52712	100283	153455	191121	239963
16323	53213	102963	153618	191192	240006
20224	53398	103057	154969	191961	240118
20878	55855	104669	155438	192116	241326
21617	56843	104737	159996	192204	243947
23471	57505	106933	160591	193207	245706
24095	57599	107383	161109	195091	245711
24800	57698	108489	162846	195793	248799
25790	59792	108765	163014	205382	250245
26293	60017	113039	168360	209290	250364
31025	61272	113234	169739	209660	250903
31077	63277	113879	169940	211115	252168
31090	68497	118450	170035	212203	253444
31412	68835	121503	170228	213472	254709
32148	69023	123803	172806	214397	258309
32499	69196	125383	173247	216246	260038
32516	69976	125587	173514	216878	260643
34043	74295	126899	176210	221106	261716
35013	74675	128331	176876	221386	263598
35094	78606	130013	177487	221540	264732
35496	80583	130280	177747	222053	265740
36558	82401	131443	177780	224942	266626
36562	86991	134512	178874	226618	267001
41140	90408	135998	179942	226992	271659

Усяго за першую палову дня 12 ліпеня 1927 г. разыграна 198 выйгрышаў

НА ВЯЛІКІМ ШЛЯХУ.

(Да чатырохгодзьдзя канстытуцыі СССР).

Дзень канстытуцыі СССР зьяўляецца вялікім сьвятам ня толькі для працоўных нашага Савецкага Саюзу. Гэты дзень памятаюць усе працоўныя сьвету. Ён напамінае ім, што ў нашай вялікай савецкай краіне няма эксплёатацыі чалавека чалавекам, што мы вырашылі і вырашаем вялізную праблему вызваленьня чалавецтва ад усякага прыгнечаньня.

У канстытуцыі Савецкай дзяржавы па словах Леніна, запісан вопыт барацьбы і арганізацыі пралетарскіх мас проці эксплёататараў і ўнутры краіны і ва ўсім сьвеце. Гэты вопыт дарагі і каштоўны для пралетарыяў усяго сьвету.

6-га ліпеня 1923 году была зацьверджана канстытуцыя Савецкага Саюзу. У гэты дзень была канчаткова аформлена наша саюзная дзяржава. Аснова нашага Саюзу—гэта добраахвотнае ўваходжаньне ў яго саюзных рэспублік.

Рабочым і сялянам Украіны Ленін пісаў: «Мы хочам добраахвотнага саюзу нацый—такога саюзу, які-б не дапушчаў ніякага гвалту адной нацыі над другой,—такога саюзу, які-б быў абгрунтаваны на поўным давер'і, на ясным разуменьні братэрскага адзінства, на поўнай згодзе». Такім зьяўляецца наш Савецкі Саюз.

Чаму мы стварылі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік?

Мы будуем у нашай краіне сацыялізм. Мы павінны аднавіць нашу гаспадарку, мы павінны ўзьняць яе на большую вышыню. Гэта задача можа быць вырашана сіламі толькі савецкіх рэспублік. Побач з прамысловымі раёнамі, мы маем раёны, якія адсталі як у эканамічных, так і культурных адносінах. Гэтак званыя акраіны пераварваліся царскай Расеяй у калёніі, яны надзвычайна адсталі. Мы абвясьцілі юрыдычную роўнасьць рэспублік. Мы павінны дамагчыся фактычнай іх роўнасьці. Нашы сілы павінны быць накіраваны і накіроўвацца ў бок узьняцьця эканамічнага і культурнага ўзроўню адсталых рэспублік. Гэту задачу мы вырашалі, мы яе поўнасьцю вырашым.

Савецкія рэспублікі зьяўляюцца сацыялістычнымі дзяржавамі дыктатуры пралетарыяту, ажыцьцяўляючымі свае задачы на аснове саюзу рабочых і сялян.

Сутнасьць савецкіх рэспублік аднолькавая. Мэты іх аднолькавыя. Усё гэта прымусіла іх аб'яднацца ў адзін Саюз.

Першы ў сьвеце Саюз Рэспублік саветаў выклікае шалёную ненавісць капіталістычнага сьвету. Існаваньне нашай савецкай дзяржавы зьяўляецца вялізным рэвалюцыянізуючым фактарам. Буржуазія мае надзею на зруйнаваньне Савецкага Саюзу. Дружнымі сіламі ўсіх савецкіх рэспублік, мы гэтыя ілюзіі буржуазіі бязьлітасна разаб'ём.

Капіталістычны сьвет ня можа вырашыць нацыянальнага пытаньня. У буржуазных краінах нацыянальнае прыгнечаньне, нацыянальная розьніца. Толькі наша савецкая дзяржава здолела дасканала вырашыць нацыянальнае пытаньне, стварыць братэрскае сужыцьцё ўсіх нацый.

Думка аб стварэньні Савецкага Саюзу была ўжо даўно. Саюзныя рэспублікі на сваіх зьездах саветаў выказваліся аб неабходнасьці аб'яднаньня ўсіх савецкіх рэспублік.

Вось, што сказаў аб гэтым у сваёй дэклярацыі 1-ы Усебеларускі Зьезд Саветаў які сабраўся ў лютым 1919 г.:

„Улічваючы разам з тым шчыльную сувязь і залежнасьць, існуючую між рабочымі і сялянамі ўсіх частак ранейшае царскае імпэрыі, зьезд лічыць, што толькі вольны добраахвотны саюз працоўных усіх, цяпер незалежных савецкіх рэспублік, забясьпечыць перамогу рабочых і сялян у іх барацьбе з усім капіталістычным сьветам. Таму зьезд зьвяртаецца да ўсіх братэрскіх незалежных сацыялістычных рэспублік з прапановай насьледаваць прыкладу рабочых і сялян Беларусі, распачаць перамовы аб устанаўленьні фэдэратыўнае сувязі між Савецкай Расеяй і між імі"

Тады гэта поўнасьцю ажыцьцёвіць не ўдалося. Былі гады грамадзянскае вайны. Гэраічна змагаліся за існаваньне рэспублік саветаў рабочыя і сяляне. Гісторыя вырашыла наша спрэчнае пытаньне з унутранай і замежнай буржуазеяй у нашу карысьць. 30-га сьнежня 1922 г. быў падпісан угавор аб стварэньні Саюзу Савецкіх Сацыялістычных рэспублік. 6 ліпеня 1923 г. была ўхвалена Канстытуцыя Савецкага Саюзу.

Канстытуцыя СССР устанаўляе ўзаемаадносіны Саюзу і Саюзных рэспублік. Апошнія зьяўляюцца суверэннымі дзяржавамі. Суверэнітэт саюзных рэспублік абмежаваны толькі ў межах, зазначаных у канстытуцыі Саюзу, і па пытаньнях, аднесеных да кампэтэнцыі саюзу.

„Па-за гэтымі межамі кожная саюзная рэспубліка ажыцьцяўляе сваю дзяржаўную ўладу самастойна, Саюз ахоўвае суверэнныя правы саюзных рэспублік".

Да сваёй кампэтэнцыі Саюз адносіць:

замежныя зносіны, арганізацыя і кіраўніцтва ўсімі ўзброенымі сіламі СССР, устанаўленьне асноў і агульнага права ўсяе народнае гаспадаркі, кіраўніцтва ўсёй транспартнай і паштова-тэлеграфнай справай, фінансавая палітыка, адзіны бюджэт і адзіная грашовая і крэдытная сыстэма, агульныя пачаткі і асновы зямельнай палітыкі, судаўпарадкаваньне, судаўніцтва, цывільнае і крымінальнае заканадаўства, законы аб працы, народная асьвета, ахова здароўя, статыстыкі. Саюз выдае ў гэтых галінах толькі агульны пачатак. Саюзныя рэспублікі дапасоўваюць свае законы з законадаўствам Саюзу.

Падкрэсьліваючы добраахвотнае ўваходжаньне саюзных рэспублік у склад Савецкага Саюзу, Канстытуцыя устанаўляе права вольнага выхаду рэспублік з саюзу.

Для таго, каб былі захаваны інтарэсы ўсіх нацыянальнасьцяў у складзе Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту апрача Саюзнага Савету, прадстаўляючага працоўных незалежна ад іх нацыянальнасьцяў, маецца Савет Нацыянальнасьцяў, куды ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасьцяў Саюзу. Гэта служыць лепшай гарантыяй таму, што інтарэсы кожнай нацыянальнасьці будуць сурова захаваны.

Саюзныя рэспублікі павінны дапасоўваць свае канстытуцыі ў адпаведнасьці з канстытуцыяй Саюзу. Намі гэта выканана. Ухваленая VIII Усебеларускім Зьездам Саветаў у красавіку гэтага году, Канстытуцыя БССР дапасавана з Саюзнай Канстытуцыяй.

Ці выканаў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пастаўленыя перад ім гісторыяй задачы? Лепшым адказам зьяўляецца мацнеючая з кожным днём эканамічная і палітычная магутнасьць Савецкага Саюзу.

Усё гэта надзвычайна непакоіць буржуазны сьвет.

У апошні час узмацнілася шалёная атака на наш Савецкі саюз. Як мы на гэта адказваем? Нязьменным імкненьнем да міру, бадаўніцтвам сацыялізму, умацоўваньнем абароназдольнасьці нашае краіны. Мы ўпэўнена ідзем па вялікім шляху. Праводзячы палітыку міру, займаючыся нашым гаспадарчым будаўніцтвам, мы павінны быць заўсёды на варце. І калі буржуазія ўздумае напасьці на нашу сацыялістычную дзяржаву, рабочыя і сяляне наш Савецкі Саюз абароняць.

„Саюзная дзяржава, гаворыцца ў дэклярацыі аб стварэньні Саюзу ССР, зьявіцца насьпешным вынікам закладзеных яшчэ ў кастрычніку 1917 г. асноў мірнага сужыцьця і братэрскага супрацоўніцтва народаў, яна будзе верным адказам проці сусьветнага капіталізму і новым рашучым крокам па шляху аб'яднаньня працоўных усіх краін у Сусьветную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку".

Ці-ж на вечны час пішам сваю канстытуцыю? Зразумела не. Будзе час, што ажыцьцёвіцца камунізм, тады ня будзе ні падзелу на клясы, ні дзяржаўнай улады. Тады канстытуцыя займе слаўнае месца ў гісторыі, тады яна будзе адным з вялічэзных гістарычных помнікаў пэрыяду гісторыі, які павінен скончыцца вызваленьнем назаўсёды чалавецтва ад нявольніцтва.

М. Сэгаль.

У Савецкай Беларусі.

Чаму зачынілася малочная.

(Грозаў, Менскае акругі).

Грозаўскае сельска-гаспадарчае таварыства арганізавала ў 1925 годзе ў Грозаве малочную. Спачатку справа ў малочнай ішла як належыць, сяляне ваколічных вёсак насілі туды малако і былі рады, што таварыства паклапацілася аб адчыненьні малочнай. Праўда, тут-жа ў Грозаве была і другая малочная, прыватная, куды таксама некаторыя сяляне насілі малако. Між малочнымі ішла канкурэнцыя за дастаўшчыка малака, бо тая з іх была мацнейшай, якая мела больш прадуктаў. Здаецца, што перамагчы павінна была малочная крэдытнага таварыства, аднак, наадварот. Вясной 1927 году, малочная таварыства зачынілася. З якой прычыны дык гэта справа ня зусім вядомая, але факт той, што зачынілася, а прыватных зараз у Грозаве маецца тры малочных. І ня толькі ў Грозаве, але нават пачынаюць прыватнікі працягваць лапы і ў вёскі (в. Русакі). Відаць, што малочная справа ў нашай мясцовасьці пры добрай арганізацыі і пастаноўцы працы справа выгадная. А што малочная крэдытнага таварыства зачынілася дык тут справа зусім незразумелая. Магчыма, што праўленьне малочнай ня мела сувязі з насельніцтвам, бо, здаецца, нават за ўвесь час існаваньня малочнай ня было ніводнага сходу сялян дастаўшчыкаў малака. Каму належыць гэту справу трэба высьветліць, а Грозаўскаму таварыству і каапэрацыі трэба сур'ёна падумаць над гэтым пытаньнем і аднавіць працу малочнага таварыства.

Сябра Ціт.

Гасьцілавіцкае „земляўпарадкаваньне".

(Вёска Гасьцілавічы, Лагойскага раёну).

Восеньню 1923 году сяляне вёскі Гасьцілавічы, рашылі перайсьці да новых формаў землякарыстаньня: завесьці шматпольле і інш.

Штурхачом да гэтага былі праведзеныя ў тым-жа годзе с-гаспадарч. курсы на вёсцы, а ініцыятарам—існуючы там с-гасп. гурток «Прапаўнік». Перашкодамі к гэтаму былі: вялікая цераспалосіца, дальнапольле і малазямельле.

Каб зьнішчыць перашкоды, неабходна было правесьці земляўпарадкаваньне, на якое сяляне і сталі намагаць, тым больш, што з боку прадстаўнікоў улады было шмат абяцанак: «Зробім скора і добра; зямлі ў нас хваціць, а не—дык лесу дадзім».

Але ня так зрабілася як гаварылася. Абяцанкі сталі цацанкамі. Земляўпарадкаваньне ў вёсцы Гасьцілавічы аж дагэтуль цягнецца. Як яно кожны год цягнулася, я падробна пісаць ня буду. Адно скажу, што кожны год, а значыць і кожны новы загадчык райземаддзелу, рабіў пасвойму. Першы Церабеж дамагаўся заняць большую плошчу земляўпарадкаваньня, адрэзаць лясной плошчы і даць сялянам зямлі па норме, лічачы лепшую Гасьцілавіцкую зямлю як сярэднюю ў Лагойскім раёне.

Пры Казлове справа стала іначай: лес які ўжо быў адведзены з уроч. Ляжня ў ліку 50 дзесяцін, ня далі, зямлю палічылі як лепшую ў раёне і такім чынам норма надзяленьня крыху ўрэзалася: год раней па вылічэньням камэрнікаў у Гасьцілавіцкай дачы зямлі не хапае 20-25 гэктараў, а год пазьней ня толькі хапіла бяз лесу, а нават ля гэтай зямлі зьмясьцілі яшчэ двух гаспадароў з вёскі Панізоўя. Сяляне кажуць: «наша зямля расьцягнулася як рызіна». За 3 з паловай гады працы земляўпарадкавацелі ўсё-ткі змаглі скласьці праэкт, які ў канцы мая м-цы б. г. быў зацьверджан зямельнай камісіяй Лагойскага РВК. Здавалася, што справа падыходзіць к канцу: зямля на палі разьбіта, праэкт прад'яўлены, застаецца зацьвердзіць ды, разьбіўшы на шнуры, закончыць працу. Дык-жа не! Як-жа, каб «новы» загадчык райземмаддзелу ды ня ўвёў што новае. Вось ён і стаў дамагацца, каб праэкт скасаваць, а скласьці новы, матывіруючы тым, што мала высялілася сялян і ня роўна адведзены сядзібы. Але калі гэтага зрабіць не ўдалося з-за пярэчаньня земляўпарадкавацеляў і сялян (пры скасаваньні трэба было працу пачынаць нанава), то земкамісія, па чале з тым-жа загадчыкам Кранцэвічам, зрабіла такую справу, ад якой і брыдка, і крыўдна, і страшна, і сьмешна (як каму): зямлю ў ліку 25 дзесяц., якая ляжыць на адлегласьці 1 з паловай вяр. ад Гасьцілаўскага поля і зусім у другі бок, за раку, пастанавілі падзяліць на ўсіх сялян пасёлку «Гасьцілавічы», у той час, як гэту зямлю год таму назад сталі араць тры гаспадары. Гэта перайначваньне, гэта новае вызвала нездавальненьне як з боку сялян, так і з боку мясцовай улады і земляўпарадкавацеляў, якім трэба праэкт і плян перарабляць і сялянам трэба будзе чакаць яшчэ некалькі год земляўпарадкаваньня і трымаць гной у хлявох.

Дык вось якім непарадкам праходзіць земляўпарадкаваньне, галоўнымі віноўнікамі якога я лічу мясцовыя земорганы і часткова земляўпарадкавацеляў. Першыя робяць як кажуць: «кожны маладзец на свой абразец» а другія, адзін раз мераюць, а сем—адразаюць. Трэба акруговай земкамісіі перайначваньне райземкамісіі адмяніць, каб можна было закончыць к восені земляўпарадкаваньне без абвостраных адносін з сялянамі. Гэту працу па плошчы каля 800 гэкт. думаю, што можна хутка выканаць.

Я. Сейбіт.

За лік прыбыткаў каапэруем беднату.

(Смалявіцкі раён, Меншчына).

Юраўскае спажывецкае т-ва арганізавана ў 1919 г. Далейшаму разьвіцьцю каапэрацыі перашкодзіла польская акупацыя. З 1921 г. каапэрацыя аднаўляе сваю працу, але сродкі, якімі ўладае каапэрацыя, мізэрныя з прычыны малога ліку пайшчыкаў з паем у 30 фунтаў жыта.

Зусім другою бачым Юраўскую каапэрацыю ў сучасны момант. Тое, што каапэрацыя на свае сродкі пабудавала будынак для крамы коштам у 1700 руб. паказвае, што каапэрацыя вырасла.

Усяго пайшчыкаў у Юраўскай каапэрацыі 441 чал. За лік прыбыткаў каапэравана 84 чал. беднаты з паем у 3 руб. 50 кап. Каапэрацыя адпускае на каапэраваньне беднаты 10 проц. з гадавага 2680 руб. прыбытку, што складае 268 руб.

Кампанія па зьніжэньню цэн прайшла добра: соль зьніжана з 98 кап. да 66 кап. за пуд.; цукар з 78 кап. да 73 кап. кілё; паркаль з 49 кап. да 41 з пал. кап. мэтр; жалеза з 22 кап. да 18 ¾ кап. кілё, падашва з 3 р. 67 кап. да 3 руб. кілё; мыла з 23 кап. да 21 кап. кусок і г. д. Каапэрацыя дапамагае правядзеньню культасьветнай працы ў вёсцы, на што адпушчае 5 проц. з гад. прыбытку, што складае 134 руб., за гэтыя грошы выпісана газэт сялянству на 20 руб. 95 кап.; літаратуры для каапэрацыйнага кутка на 6 руб. 38 кап.; атраду «юных піянэраў» 3 руб., рэшта на адчыненьне дзіцячых ясьляў, і выпуск газэты «Чырвоны Араты». Юраўскае спажывецкае таварыства мае два аддзяленьні: у вёсках Мглё і Бабі-Лес.

Н. А. В.

Балоты і мхі—ў добрую глебу.

(Бабруйшчына).

За апошнія гады мэліярацыйная праца ў Бабруйшчыне, асабліва ў палескай яе частцы значна разгарнулася.

Сялянства зразумела карысьць мэліярацыі і таму яно арганізоўваецца і ахвотна ўступае ў члены мэліярацыйных таварыстваў.

Вялікая праца на асушцы балат ужо вядзецца больш чымся 2 гады. І за гэты кароткі пэрыяд мы маем досыць вялікія дасягненьні. Адна з вялікіх і важных мэліярацыйных работ у Бабруйшчыне (у межах ранейшае Слуцкае акругі) гэта асушка 8.000 дзес. балота ў савецкай гаспадарцы «Марыно».

Марыно—ранейшы панскі маёнтак у сучасны момант савецкая гаспадарка. На асушку гэтых балот дзяржаў адпускае 1.333.000 р., каб з вязкай і цэпкай дрыгвы, зрабіць урадлівую зямлю, якая прынясе карысьць беднаму палескаму сялянству. У гэтым годзе ў «Марыно» будзе пракладзена дарога праз балоты, дзе раней чалавеку было цяжка прабрацца. Гэта дарога зьвяжа і эканамічна ажывіць падзеленыя два раёны — Любаньскі (Бабруйшчына) і Пятрыкоўскі (Мазыршчына). У выніку вялікай працы ўдасца расьсяліць на гэту зямлю—800 сем'яў, альбо 3000 душ. Апроч гэтага ў Бабруйшчыне, у межах ранейшае Слуцкае акругі, у гэтым годзе будзе пракопана канава на плошчы 11 кілёмэтраў, і праведзен цэлы шэраг іншых работ усяго на суму 130.000 руб. Нядаўна распачалася новая праца (каля рэчкі Цуфалкі), дзе занята 400 спэцыялістаў-землякопаў, выпісаных з Магілеўшчыны. На месцы гэтае працы пабудаваны добрыя баракі, сталоўка, лазьня, а таксама лекавы пункт.

М. Астроўскі.

Пашырэньне вытворчасьці.

(Папяровая фабрыка „Профінтэрн" Н. Барысаў).

Вытворчасьць на фабрыцы падымаецца з кожным годам. Так, напр: у 1924-25 г. уся прадукцыя вылічалася ў 1713 тон (140 проц. праграмнага заданьня) у 1925-26 г. вытворчасьць паднялася да 1857 тон (121 пр. заданьня) і ў 1926-27 г. за першыя два кварталы вытворчасьць фабрыкі дасягнула 1060 тон. Сабекаштоўнасьць вырабу фабрыкі наступная: у 1924-25 г.—549.506 руб., у 1925-26 г.—614.090 руб. і за першыя 2 кварталы 1926-27 г.—363.541 руб.

На павялічэньне вытворчасьці ў значнай меры мела уплыў увядзеньне прэміяльных выдач, якія, па некаторых кварталах дасягаюць 40 проц. усяе зарплаты рабочых, а таксама і павышэньне працоўнай дысцыпліны сярод рабочых.

Сыравінай фабрыка забясьпечана. Запас драўніны на 1 красавіка быў ровен 400 руб. саж., папяровага браку—3.660 пуд., дроў для апалу—2100 куб. саж.

В. С.

Акруговая хроніка.

Крэдыт пацярпеўшым ад гурагану.

Бабруйск. Акруговы с.-г. банк атрымаў крэдыт у суме 45.000 руб. на крэдытаваньне насельніцтва, пацярпеўшага ад гурагану, 8.600 руб. крэдыту ўжо раздадзена сялянству.

15.000 руб. на крэдытаваньне беднаты.

Бабруйск. У хуткім часе акруговы с-г. банк адпушчае 15.000 руб. на крэдытаваньне беднаты. Мяркуецца крэдытаваць 100 бядняцкіх гаспадарак.

Змоўшчыкі „адзінай і непадзельнай".

Кастрычнікавым пераваротам працоўныя масы Расеі зьнішчылі дзяржаву эксплёататараў і захапілі палітычную ўладу ў свае рукі. Яны зрабілі гэтую рэвалюцыю дзеля таго, каб прыступіць да ўтварэньня новае грамады, у якой няма месца эксплёатацыі і ўціску.

Пан жыве тым, што на яго працуюць сяляне на зямлі, якую ён называе сваёй зямлёй. Капіталіст жыве тым, што на яго і за яго працуюць пралетары на фабрыках і заводах, якія ў грамадзе эксплёататараў прызнаюцца яго асабовай, яго прыватнай уласнасьцю.

У дзяржаве ўласьнікаў кіруюць саноўнікі і чыноўнікі, якія, паходзячы самі з папоў і буржуазіі, на ўсё глядзяць вачыма ўласьнікаў-эксплёататараў. Наша гісторыя склалася так, што расейская, ці вялікарасейская, як мы яе называем па старай прывычцы, нацыянальнасьць заваёўвала і падпарадкавала сабе вобласьці, насялёныя іншымі плямёнамі, цюркскімі, украінскай, беларускай, літоўскай, польскай і г. д. народнасьцямі.

На чале заваявальных паходаў заўсёды стаялі ўціскацелі расейскае народнасьці. Існуючы жорсткай эксплёатацыяй расейскіх сялян, далучыўшы да яе насяля гэткую-ж пяшчадную эксплёатацыю буйна-прамысловага пралетарыяту, яны пераносілі той-жа суровы ўціск у нова заваяваныя вобласьці і прыдавалі яму тут самы зьверскі характар.

«Христолюбивое воинство», якім кіравалі «благочестивейшие» князі, літаральна вырэзвала насяленьне цэлых вобласьцей і доўгі час абарачвала іх у абязлюднелыя пустыні. Насяленьне, якое захоўвалася, разьбягалася ў глухія лясы, за недаступныя дрыгвы, у бясплодныя горы. Усе найлепшыя землі захопліваліся царамі, князямі,—ваяводамі, і генэраламі, прыдворным зброддзем, палюбоўнікамі і палюбоўніцамі цароў і царыц. Насяленьне, што заставалася жывым, закабалялася гэтымі буйнымі расейскімі памешчыкамі і за якімі насоўваліся хмары дробнае саранчы з гэткімі-ж прагавітымі апэтытамі.

Усё гэта тварылася ня толькі ў мінулыя вякі. Яшчэ і зараз жывуць старыкі, якія маглі-б расказаць, як ішло наглае разрабаваньне башкірскіх зямель якія новыя і новыя нацыскі рабіліся на туркмэнаў, кіргізаў і узьбэкаў, як са ўсіх бакоў насоўваліся расейскія драпежнікі.

Расейская ўлада ведала, як шалёна ненавідзяць яе зьняволеныя народнасьці. Яна ўсюды прымала свае меры, каб адцягнуць і не дапусьціць адплаты. Усюды яна трымала вялікія вайсковыя сілы з прыдушаных расейскіх сялян, якіх ашуквалі, упэўняючы іх нібыта расейскаму селяніну будзе лепей, калі ён раздавіць усякае супраціўленьне украінскага, беларускага, польскага, крымскага, казакскага, туркестанскага, узьбецкага селяніна. Усюды расейская ўлада трымала цэлыя полчышчы расейскіх чыноўнікаў: генэрал-губэрнатараў, губэрнатараў, спраўнікаў і гарадавых якія лічылі сябе царкамі над бяспраўным тубыльным насяленьнем. Усюды расейская ўлада рассылала расейскіх праваслаўных папоў, якія прымусова загачаючы тубыльцаў у хрысьціянскую царкву, тым самым стараліся абярнуць іх у саюзнікаў расейскіх уціскачоў. Усюды расейская ўлада старалася задушыць нацыянальную культуру, усюды дапушчала толькі расейскія школы, з выкладаньнем на расейскай мове, з тупымі настаўнікамі-чыноўнікамі, якія аднасіліся з пагардай да палякаў, украінцаў, татар, башкіраў, кіргізаў, туркмэнаў. Нешматлікія расейскія школы, якія сям-там адчыняла расейская ўлада ў заваяваных вобласьцях, мелі адну галоўную мэту: адарваць вучняў-тубыльцаў ад нацыянальнага жыцьця, абярнуць іх у саюзьнікаў пануючай расейскай нацыянальнасьці, у яе вартаўніцкіх сабак, якія пастаянна дапамагалі-б расейскім чыноўнікам. З тэй-жа мэтай расейская ўлада прыцягвала на свой бок буйных тубыльных памешчыкаў, князёў і баёў, распушчала іх падачкамі, дапамагала адбіраць землі ад тубыльных сялян, нагараждала тытуламі, чынамі і ордэнамі, абарачала ў расейскіх саноўнікаў.

Гэтак здарылася, што ўсе нерасейскія нацыянальнасьці царскае Расеі існавалі па-за гісторыяй і ў працягу многіх сталецьцяў не рабілі ніякіх зьдвігаў у сваім эканамічным і культурным разьвіцьці. Яны існавалі не для сябе, а для ўціскачоў з расейскай нацыянальнасьці і для іх хаўрусьнікаў з тубыльцаў.

Кажуць, у Расейскай імпэрыі ня было калёній. Так, яна ня мела заморскіх калёній, але затое былі аграмадныя ўнутраныя калёніі. І з насельніцтвам гэтых калёній, напрыклад, у Сярэдняй Азіі, расейская ўлада распраўлялася ня з меншай, а з большай яшчэ жорсткасьцю, чым ангельцы гаспадараць у Эгіпце.

Рабочыя і сяляне захапілі ўладу дзеля таго, каб пабудаваць грамаду, у якой няма эксплёатацыі і ўціску. Дзеля чаго ім уціскаць каго-небудзь, калі яны жывуць сваёй уласнай працай і калі яны ведаюць, што гэту працу можна зрабіць далёка больш вытворчай, чым яна была ў старой Расеі? Ці-ж ня бачаць яны, які вялікі крок наперад ужо зрабілі за апошнія чатыры гады? І ці-ж так цяжка зразумець, што інтарэсы ўсіх рабочых і сялян вымагаюць, каб з кожным годам усё лепей жылося рабочаму і селяніну на **Украіне, у Крыме, у Туркестане, у Беларусі?**

Вось чаму адным з першых дзеяньняў савецкай улады, як толькі яна нарадзілася ў Кастрычнікавай рэвалюцыі, была **«дэклярацыя (абвяшчэньне) правоў народаў Расеі»**. А хутка за ёю адбылася пастанова Савету Народных Камісараў, якая абвесьціла наступныя палажэньні, што зрабіліся асноўнымі ў нацыянальнай палітыцы савецкага ўраду: 1) роўнасьць і суверэннасьць (верхавенства, паўната ўлады) народаў Расеі; 2) правы народаў Расеі на свабоднае самавызначэньне аж да аддзяленьня і ўтварэньня самастойнае дзяржавы; 3) адмена ўсіх і ўсялякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаваньняў; **4) свабоднае разьвіцьцё нацыянальных меншасьцяў, якія насяляюць тэрыторыю Расеі.**

Усе ведаюць, як шырока прымяніла савецкая ўлада гэтыя палажэньні, калі яна заключала мірныя ўмовы з Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, Польшчай, Фінляндыяй, Турцыяй, Кітаем.

І ўвесь сьвет бачыць і ведае, як пасьлядоўна ажыцьцяўляліся гэтыя палажэньні і ў той час, калі наша краіна называлася яшчэ Расейскай Сацыялістычнай Фэдэратыўнай Савецкай Рэспублікай, і асабліва з таго часу, як, атрымаўшы магчымасьць поўнасьцю перайсьці да мірнае творчае працы, яна абярнулася ў свабодны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Нашы ворагі бачаць, якая напружаная творчая праца разварачваецца ва ўсіх саюзных і аўтаномных рэспубліках і вобласьцях. Яны бачаць з якой настойлівасьцю выкараняюцца ўсе астаткі подлых часоў нацыянальнага ўціску; закладваюцца асновы новай эканомікі, якая выяўляе разрыў з сярэднявякоўшчынай, расьце нацыянальная школа, якая ў пяршыню вырывае масы тубыльцаў з бяскультурнага быцьця, разьвіваецца і мацнее нацыянальная культура, праз якую масы далучаюцца да шырокае чалавечае культуры.

І бачаць нашы ворагі, што сяляне і рабочы ўсіх гэтых шматлікіх рэспублік і вобласьцяў прыходзяць да палітычнага быцьця,—сам пачынае кіраваць сваімі тэрыторыямі і ствараае з тубыльнага насяленьня кадры адданых яму працаўнікоў, што прышлі на зьмену расейскім саноўнікам і чыноўнікам.

Бачаць нашы ворагі, як хутка зьнікае дарагая для іх «адзіная і непадзельная» Расея: Расея папоў і рабоў, Расея барбарства, Расея дзікага насільства і ўціску, Расея цароў, памешчыкаў, буржуазіі, чыноўнікаў, папоў, Расея падлізваньня і лёкайства, Расея нагайкі і бізуна, Расея—адзіная і непадзельная ахвяра буржуазіі, памешчыкаў і чыноўнікаў.

Бачаць яны, што замест таго ўтвараецца магутны саюз працоўнага народу, моцны сваёй цеснай ўнутранай, свабоднай спайкай.

Бачаць яны, што з кожным годам ў вялікім расьце ўсё больш магутным робіцца гэты саюз.

На простыя выступленьні ў іх няма сілы. Яны здольныя ўжо толькі на подлыя тварэ з-за вугла.

Зразумей-жа, украінец, туркмэн, зразумей, беларус і татарын, што **гэтыя ўдары накіраваны супроць цябе.**

Яны накіраваны супроць тваёй нацыянальнай свабоды, супроць тваёго нацыянальнага разьвіцьця.

Прагнаны табою зьнявольнік зноў хоча вярнуцца, каб зноў зьняволіць цябе і задушыць расткі нацыянальнага жыцьця.

Гэтыя князі, гэтыя калчакоўскія і дзянікінскія афіцэры, гэтыя слугі ангельскае разьведкі ўжо ўпісалі крывавыя старонкі ў гісторыю тваёй барацьбы за сваё вызваленьне. Яны хочуць узваліць новыя няшчасьці на нашу краіну.

Грозная рука рабочае клясы і сялянства пакажа ўсім гэтым змоўшчыкам супроць народу, што яна ўмее біць метка, сурова і няшчадна.

Супроць бюракратызму.

«Трэба падымаць сацыялістычную прамысловасьць, усімі сіламі падымаць вытворчасьць працы, з усёй энэргіяй праводзіць сацыялістычную рацыяналізацыю вытворчасьці, усімі мерамі паляпшаць сельскую гаспадарку, паляпшаць і ўмацоўваць транспарт; трэба падцягнуць і разьвіць вайсковую прамысловасьць для абароны краіны, трэба ўзмацніць барацьбу з балячкамі бюракратызму. Мы ня ведаем і ня можам ведаць, калі вораг адкрыта пойдзе на СССР са штыком».

З адозвы ЎсеКП(б) да ўсіх рабочых і сялян.

АМАТАРЫ ВАЛАКІТЫ.

(Зьмест фэльетону).

У Барысаўскім райвыканкоме працаваў дзелаводам гр. Хадасевіч. У час перавыбарнай кампаніі саветаў, як і часта гэта здараецца, гр. Х працаваў па начах, бо гэтага патрабавала справа.

У падзяку за працу звыш паложанага РВК выносіць пастанову аб выплаце т. Х. дзесяці рублёў «за звышурочныя». Пасьля т. Х. уходзіць добраахвотнікам у Чырвоную армію і пры канчатковай расплаце райвыканком ня выплаціў яму паложанай кампэнсацыі за 2 тыдні.

Ужо з Чырвонай арміі т. Хадасевіч падае заяву ў РВК аб выплаце яму за 2 тыдні.

22 сакавіка РВК разглядае заяву т. Х. і выносіць пастанову,—вось яна: «У пратаколе № 7 ад 1 сакавіка г. г. § 3 адмяніць ад выдачы 10 руб. за вверхурочную працу, а выдаць яму 2-хтыднёвую помач у суме 14 руб. з вычатам выдадзеных 10 руб.».

Як бачыце беларусізацыя хоць куды, а сама пастанова, дык проста цукерка...

Чырвонаармеец т. Хадасевіч падае заяву ў ЦВКБССР, які 12 мая прапануе Барысаўскаму акрвыканкому вырашыць самому гэтую справу.

17 мая № 1054 акрвыканком усю перапіску накіроўвае для дачы тлумачэньня ў райвыканком, хаця пры перапісцы маюцца заверанае выпісь з пратаколу РВК ад 22-3 1927 г.

Гэтая перапіска ў райвыканкоме ідзе пару дзён, а апошні ў некалькіх дзесятках сажэняў ад акрвыканкомаў.

Нічога, што на прапанове АВК падпісана «В.-тэрмінова», а райвыканком сьпяшыць ня любіць і толькі 31 мая за № 3987 накіроўвае ў акрвыканком усю перапіску і ў сваім тлумачэньні паміж іншым гаворыць,—«выплаціць за звышурочную работу ня можа, так як гэткай не назіралася і не адчувалася і прымусу з боку РВК не магло быць, а наадварот, РВК такія працы без дазволу забараняў».

Каб цябе маланка, вось гэта дыплёматы, дык дыплёматы,—так і пішуць «не назіралася і не адчувалася».

А як-жа, браточкі мае, валакітчыкі, вы, дарагія з вашымі пратаколамі ў якіх яскрава ўсё гаворацца, што і назіраліся, і адчувалася, нават пастанавілі за «сверхурочную» работу грошы выплаціць?

Вось люблю, калі людзі самі сябе, як тая ўнтэр-афіцэрская ўдава, высякуць: і самым добра, ну ды і людзям весела...

Вясёлы.

68 ДЗЁН БЮРАКРАТЫЧНАЙ МАМОНЕ.

(Гомель Зах. чыг.).

Ёсьць цьвёрда склаўшаяся ўяўленьне, што бюракратычней чыгункі нічога няма.

Чыгуначныя працаўнікі марна імкнуцца давесьці адваротнае, гаворачы аб мерах якія ўжыты для зьнішчэньня бюракратызму, якія даюць добрыя вынікі, якія... і г. д. і г. д.

Але возьме ды здарыцца ліха якое, бяз жалю пабівае ўсе гэтыя довады.

Так здарылася і ў Гомелі.

Вось гэтае здарэньне: 11 сьнежня 1926 г. Гомельская гарадзкая станцыя Заходніх чыгунак узьняла хадайніцтва аб пабудове цёплай будкі для вагаў на пакгаузе. Перапіска праз 6 дзён папала к нач. 4 вучастку аддзелу шляху, марынавалася тут таксама 6 дзён, потым пашла ў 12-цідзённае вандраваньне між начальнікам аддзелу шляху і камэрцыйным аддзелам за дазволам крэдыту і выяўленьнем кошту пабудовы.

Потым пачалося капіраваньне пляну, узгадненьне яго на месцы пабудовы і ў кіраўніцтве чыгункі. Цягнулася гэта... 39 дзён. Дазвол на пабудову прыехаў к выканаўцу праз 5 дзён. Гэтакім чынам папярэднія захады занялі 68 дзён!. А пабудову зрабілі ў 8 дзён, толькі ўсяго!

Але цікавей за ўсё тое, што будку будавалі з матар'ялаў ад разабранай будкі з пераезду, дзеля чаго ня трэба было ўсіх захадаў па ацэнках, а праца ўся праароблена незалежна ад зробленых фармальнасьцяў у кіраўніцтве і бяз узгадненьня з зацікаўленымі асобамі. Вось дык нумар! Навошта-ж 68 дзён убілі? Ці-ж не на бюракратычную мамону?

Да рэчы, будка скончана пабудовай 26 лютага 1927 г. калі ў ёй патрэба ўжо мінулася, бо вясна пачыналася!

У падзяку, на вінаватых накладзена загадам па чыгунках адміністрацыйнае ўзысканьне. Але час, здаецца, больш рашучых мерапрыемстваў, каб іншым не павадна было. Бо і на чыгунках бюракратызму таксама канец даць трэба.

Хв. Шынклер.

Каралінская страхкаса.

Для ўсялякай пасады вызначан час працы. Ёсьць, праўда, пасады для якіх час працы не абмяжоўван па розных прычынах: адны з такіх працоўнікоў працуюць больш вызначанага часу, другія—менш. Ёсьць і такія пасады для якіх зусім не абмяжован час працы,—іх можна сустрэць усюды, толькі вельмі рэдка на месцы сваёй асноўнай працы.

Ня ведаю, як абстаіць гэта справа з працаўнікамі гэтага тыпу ў другіх раёнах, але ў Каралінскім гэта так.

Вы захварэлі. Вам выдаецца бальнічны лісток у страхкасу. З гэтым бальнічным лістком вы павінны пайсьці да ўпаўнаважанага страхкасы і атрымаць дапамогу. Рэч вядомая і простая, але-ж у жыцьці гэта бывае трошкі інакш.

У вас ужо ўсё гатова і бальнічны лісток і розныя спраўкі, але-ж хоць вы і разьлічваеце заўтра альбо пасьлязаўтра атрымаць дапамогу, вы яе атрымаеце прыблізна цераз два м-цы.

У страхкасе цераз два м-цы? Многія з вас запытаюць. Хворы можа-ж памерці...

Ну, дык што?

Здаецца гэта вельмі проста. Вы заходзеце а 9-й гадз. раніцы, пытаецца: Казлоўскі (упаўн. страхкасы) тут?

Не, яшчэ ня прышоў. Прыйдзеце а 10 гадз. скажуць, што быў, але куды небудзь паклікалі,—скора прыдзе. Калі-ж прыдзеце а 12-1 г. дык Казлоўскі ўжо пайшоў палуднаваць, а пасьля поўдню звычайна-ж цяжка ісьці на працу.

Вядома, так ня кожны дзень у яго разьмяркован,—ёсьць ад усялякіх правіл адступленьні.

Бываюць такія дні, калі вы Казлоўскага застанеце, але ўсё роўна грошы не атрымаеце, бо ён будзе заняты другой працай,—як напр: працай прымірыцельнай камеры.

Гэты маленькі факт, калі ён робіцца ў кожным раёне складае вельмі гнусны і вельмі падобны да бюракратызму малюнак.

П. Л.

Жыцьцё і праца асьветніка.

ЗАДАЧЫ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ.

(Да працы ўсебеларускіх курсаў па перападрыхтоўцы ліквідатараў няпісьменнасьці і малапісьменнасьці).

Камуністычная партыя і савецкая ўлада рашуча паставілі перад нашай краінай вялізарнейшую задачу ў галіне індустрыялізацыі і перабудовы ўсяе гаспадаркі на сацыялістычных падставах.

Для ажыцьцяўленьня гэтага надзвычайна важнага пытаньня ў сучасны момант мы маем ужо цэлы шэраг мерапрыёмстваў і захадаў савецкае ўлады, як у галіне прамысловасьці, так і ў галіне сельскае гаспадаркі.

Але прасунуць справу індустрыялізацыі больш шпарка і з большым тэмпам магчыма толькі тады, калі кожная працоўная адзінка нашага саюзу будзе ўсямерна дапамагаць у гэтай справе, калі ўсё насельніцтва будзе стала ўлўляць значэньне пастаўленай задачы.

Усім вядома, што праблемы індустрыялізацыі краіны і перабудовы гаспадаркі на новых сацыялістычных падставінах, хутчэй зможа зразумець тая частка працоўнага насельніцтва, якая ўжо зьліквідавала сваю і тэхнічную і палітычную няпісьменнасьць і малапісьменнасьць; якая ўжо разьбіраецца самастойна з кніжкай і газэтай; якая прымае сьціслы ўдзел у працы саветаў і розных грамадзкіх арганізацый; якая імкнецца да каапэраваньня.

Ня гледзячы на разгорнутасьць у апошнія гады працы па зьнішчэньню няпісьменнасьці, як у горадзе, так і асабліва на вёсцы, нажаль прыходзіцца ўсё-ж адзначыць, што лік няпісьменных па ўсяму Саюзу нашых Савецкіх Рэспублік яшчэ надзвычайна вялікі. На абшарах аднэй толькі Беларусі разам з Гомельшчынай, мы маем на 1 студзеня 1926 г. 1.096.391 чал. няпісьменных, з якіх ва ўзросьце ад 16 да 35 гадоў 756.807 чал., пераросткаў ад 12 да 16 гадоў 176.000 чал. і дзяцей ад 8 да 12 год 163.584 чал.

Зразумела, што пабароць цемру, як цяжкую спадчыну царызму і асабліва сярод дарослага насельніцтва, вельмі цяжка, бо ня ўсе яшчэ пласты працоўных зразумелі неабходнасьць зьнішчэньня сваёй няпісьменнасьці. Падлік няпісьменных паказаў, што няпісьменнасьць найбольш усяго пануе ў нашай вёсцы і асабліва сярод жанчын.

У сучасны момант Камісарыят Народнае Асьветы праводзіць усеагульнае навучаньне, гэта значыць, што ўсе дзеці абоега полу з 7 да 15 гадоў павінны быць паступова ў працягу 10 год ахоплены масавай школай. Такім чынам, такі рэцыдыў няпісьменнасьці, які назіраецца ў сучасны момант, за лік пераросткаў дзяцей, не папаўшых у школы, будзе зьмяншацца, што некалькі аблегчыць справу самае барацьбы з цемрай.

Але, як-бы мы шпарка ня будавалі сетку нашых школ, усё-ж перад намі ў парыяд правядзеньня ўсеагульнага навучаньня, у ва ўвесь рост будзе яшчэ стаяць вялікая армія зусім няпісьменнага насельніцтва, якое ня толькі ня можа прымаць удзел у працы перабудовы гаспадаркі, але, часамі пад уплывам навуськіваньня зьлейшых нашых ворагаў, па сваёй цемры будзе перашкаджаць гэтай справе.

У зьвязку з чым, перад намі зараз, як ніколі яшчэ не стаяла, высоўваецца надзвычайнай вартасьці пытаньне рашучай барацьбы за зьнішчэньне няпісьменнасьці сярод адсталых пластоў насельніцтва, пытаньне—заклікаць на працу ў гэтай справе ўсе культурныя сілы гораду і вёскі, выхаваць сталых, добра падрыхтаваных барацьбітоў з няпісьменнасьцю, вывудзіць так званых «прафэсыяналаў» у барацьбе з цемрай з тым, каб усё працоўнае насельніцтва зрабіць пісьменным, якое-б магло поўнасьцю стаць апорай савецкае ўлады.

Вялікую ролю зьнішчэньня няпісьменнасьці т. Луначарскі адзначае наступным: «усеагульная пісьменнасьць ёсьць неабходная ўмова разьвіцьця буйнае прамысловасьці, неабходная ўмова да першых крокаў па шляху к сацыялізму».

У нас па Беларусі справа зьнішчэньня няпісьменнасьці нажаль і да гэтага часу ў некаторых мясцох ішла як-бы «самацёкам». Ня было сталых арганізацыйных форм, ня было сыстэматычнага мэтадычнага кіраўніцтва, ня было свайго кадра працаўнікоў-ліквідатараў. Асноўнае ядро ў гэтай справе ў вёсцы складалі вясковыя настаўнікі. Але, будучы адказным у першую чаргу за працу ў школе сацвыху, настаўнік ня мог стала знаёміцца з рознымі формамі і мэтадамі працы лікбеза сярод дарослых, і праца зьнішчэньня няпісьменнасьці ішла разнастойна, а ў зачастую і зусім кустарна.

У сувязі з чым на мясцох ня было сталага вучоту, ня было належных вынікаў працы. Уся праца зводзілася, галоўным чынам, к колькаснаму ахопу няпісьменнага насельніцтва і мала зьвярталася увагі на якасьць самое працы. Акрамя таго, праца па зьнішчэньню няпісьменнасьці зусім не ўвязвалася з усёй палітасьветпрацай. Ліквідацыя няпісьменнасьці ў зачастую вялась зусім абасоблена, на якую і нават хата-чытальня не зьвяртала належнае ўвагі, лічачы гэтую справу, як быццам не сваёй.

Калі яшчэ прыняць пад увагу, што значная колькасьць ліквідатараў індывідуальнага і групавога абучэньня як раз зьяўлялася не настаўнікамі (камсамольцы, служачыя ўстаноў, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы і г. д.), дык ніякай сыстэматычнай працы сярод гэткага складу для яго падрыхтоўкі з боку мэтодыкі не вялася, акрамя выпадковых сходаў па агульных пытаньнях лікбеза.

У сучасны момант перад намі ў справе зьнішчэньня няпісьменнасьці і малапісьменнасьці стаіць задача—мець у кожным раёне абавязкова апорныя—лікпункт і школу малапісьменных з тым, каб іх кіраўнікамі былі стала і ўсебакова падрыхтаваныя ў галіне лікбеза настаўнікі-ліквідатары, якія-б аб'ядналі навокал сябе ўсю працу зьнішчэньня няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, як з арганізацыйнага боку, так і з боку мэтадычнага.

Перападрыхтоўка ліквідатараў на мясцох у працягу ўсяго году [illegible] канфэрэнцый, сходаў, гурткавых занаткаў і інструктажа райсец і лікпунктаў і школ малапісьменных—павінна стаць асноўнай работай апорных лікпунктаў і школ малапісьменных у раёнах.

На гэткі шлях працы па лікбезу Народны Камісарыят Асьветы стаў яшчэ з самага пачатку бягучага году. Але на мясцох зачастую замест апорных лікпунктаў з кіраўніком-мэтадыстам райкультаддзелы ўтрымлівалі так званых «райарганізатараў», ад якіх, як зусім не падрыхтаваных працаўнікоў, ніякае карысьці ў кіраўніцтве справай і асабліва з боку мэтодыкі ня было.

Усебеларускія курсы перападрыхтоўкі ліквідатараў няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, якія зараз утвораны у Менску з прадстаўнікоў ліквідатараў з месц, маюць як раз сваёй мэтай азнаёміць слухачоў, як з мэтадамі самое працы на лікпунктах, так і з індывідуальна-групавым навучаньнем. Курсы павінны будуць і сапраўды выкаваць сталых мэтадыстых у справе зьнішчэньня няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

Акрамя таго, у задачу курсаў уваходзіць даць веды ў галіне беларусазнаўства, краязнаўства і прывіць слухачом навыкі карыстаньня важнейшымі мэтадамі і формамі агітацыі і прапаганды за справу лікбеза і арганізацыю грамадзкасьці навокал гэтай справы, шляхам утварэньня ў вёсцы сеці ячэек т-ва «Прэч Няпісьменнасьць», а таксама формы і мэтады сталае ўвязкі справы зьнішчэньня няпісьменнасьці з усімі відамі пазашкольнае палітасьветпрацы.

Слухачы курсаў павінны будуць у вёсцы выканаць поўнасьцю погляд тав. Крупскай, якая сказала: „адной з важнейшых задач у справе ліквідацыі няпісьменнасьці ёсьць уменьне арганізаваць навокал гэтай працы ўсіх, якія могуць быць карыснымі, указаўшы ім бліжэйшы шлях да гэтай мэты".

Трэба спадзявацца, што паўторныя курсы ліквідатараў, сыстэматычная перападрыхтоўка іх праз апорныя лікпункты і больш уважлівыя адносіны належных органаў пры асыгнаваньні патрэбных сродкаў на разгортваньне сеці апошніх лікпунктаў і побач з імі такіх-жа апорных школ малапісьменных у будучым значна дапамогуць выкаваць той неабходны кадр моцных працаўнікоў лікбеза, які дапаможа камуністычнай партыі і савецкай уладзе поўнасьцю апраўдаць думку той-жа Крупскай, якая сказала: «заветы Леніна выканаем, калі краіну грамаце вывучым».

Хвасьцюк.

АБ ПРЫЁМЕ Ў ВНУ.

У сёлетнім годзе НКА дапускае паступаць на другі курс пэдфаку скончыўшых настаўніцкія інстытуты да рэвалюцыі, але чамусьці такім асобам неабходна трымаць калёквіумы па грамадазнаўству, у той час, калі скончыўшыя пэдтэхнікумы пасьля двухгадовага стажу наступаюць на другі курс без калёквіумаў. На мой погляд такое становішча няжыцьцёва. Вядома, што ўсякае правіла вырабляецца ў залежнасьці ад жыцьця. Разгледзім жыцьцё. Скончыўшыя настаўніцкія інстытуты вядуць працу ў сямігодках, у старэйшых канцэнтрах або загадчыкамі гэтых самых сямігодак. Частка з іх працуе ў пэдтэхнікумах. Пад кіраўніцтвам такіх настаўнікаў працуе шмат скончыўшых пэдтэхнікумы. Шмат скончыўшых настаўніцкія інстытуты вядуць грамадзкую працу на мясцох, яны ўваходзяць у склад мясцовых прафэсыйных арганізацый і кіруюць мэтадычнымі справамі па раёнах. З гэтага відаць, што скончыўшыя інстытуты маглі-б з вялікім посьпехам атрымаць дазвол да паступленьня ва пэдфак без калёквіумаў. Няўжо яны ведаюць па грамадазнаўству менш сваіх маладшых таварышоў ці тут іншы сэнс гэтага мерапрыёмства, якое незразумела для інстытутчыкаў. К таму-ж іх ня так шмат на Беларусі, каб ставіць так пытаньне аб прыняцьці ва унівэрсытэт. Апроч таго, калі і пойдуць на пэдфак скончыўшыя інстытуты, дык болей маладзейшыя, якія скончылі інстытуты ня так даўна. Старэйшым вучыцца на пэдфаку ня прыдзецца, бо сілы іх патрачаны на іншую працу. Трэба было-б перагледзець закранутае пытаньне і ўнесьці палепшаньне для інстытутчыкаў, даўшы ім магчымасьць ня трымаць залікаў па грамадазнаўству.

Настаўнік.

Гомельскія акруговыя настаўніцкія курсы.

Калі вясковае настаўніцтва «Старой Беларусі» ўжо мае значны вопыт працы на беларускай мове, то настаўніцтва нашай, нядаўна далучанай да БССР, Гомельшчыны яшчэ толькі прыступае да яе. Гэты факт ня мог не налажыць сваёй пячаткі на зьмест праграмы нашых курсаў. І калі Менскія напрыклад курсы, згодна карэспандэнцыяй—галоўную увагу зварочваюць на пытаньні практыкі працы школы і адпаведна мэце прапрацоўваюць: мэтодыку роднае мовы, матэматыкі, пэдалёгію, мэтодыку сьпеваў і г. д., то ў зьмесце працы Гомельскіх курсаў на гэта няма часу: у нас асноўнымі зьявіліся пытаньні беларускай мовы; літаратуры, гісторыі і геаграфіі Беларусі. На гэтыя дысцыпліны адведзена было дзьве трэці часу працы курсаў, рэшта на распрацоўку вытворчых пляноў працы школ, піанэраў, грамадазнаўства, краязнаўства і іншыя пытаньні.

Найбольш здавальняюча прапрацаваны—белмова і беллітаратура. Вынікі прапрацоўкі гэтых пытаньняў больш менш значныя. Што-ж тычыцца піанэрруху, гісторыі і краязнаўства, то тут засталося парожняе месца. Віною тут і яскрава выразныя лекцыйныя мэтады, і ня вельмі ўдалы падбор выкладчыкаў на гэтых дысцыплінах. Курсы прапрацавалі 5 тыдняў. Асноўная мэта, якая была пастаўлена перад курсамі, дасягнута: курсы падрыхтавалі 86 настаўнікаў, маючых магчымасьць працаваць на бел. мове і у большай значнасьці сваёй кіраваць беларускімі гурткамі на мясцох. Самы склад курсантаў па полу, узросту, стажу, пасадзе і партыйнасьці гаворыць за тое, што на шляху беларусізацыі акругі мы становімся на моцныя і пэўныя ногі.

Л. Кужалеў.

Марксысцкі... толькі ў мяне.

Калі вывучаюць яўрэйскі талмуд ці біблію, дык кожную цытату (посык) з іх, кожны прававерны яўрэй тлумачыць, талкуе пасвойму. І кожны крычыць, што яго тлумачэньне ёсьць самага Іеговы, самай найлепшай якасьці.

Здаецца, што які-небудзь гістарычны факт павінен тлумачыцца ўсімі настаўнікамі аднолькава. Бо марксызм, гэта не талмуд для ўсіх адзін і той-жа.

Але гэта дарагі чытач, толькі здаецца нам.

На менскіх агульна-адукацыйных курсах разважаюць інакш.

... Сёньня мы разгледзім прычыны расейска-японскай вайны, кажа выкладчык на гісторыі рэўруху... Яна патрэбна была гандлёваму і часткова прамысловаму капіталу.

Праходзіць тыдзень ці крыху меней, і па курсу агульнай ужо гісторыі мы падходзім да расейска-японскай вайны.

... Яна не патрэбна была нікім капіталістам, і наогул нікому яна не патрэбна была.

Вучні ўсіх пяці груп у няўдуменьні. Каму з іх верыць? Хто праў? У каго сапраўды марксысцкае тлумачэньне? Бо кожны з выкладчыкаў б'е сабе ў грудзь кулакам і крычыць «марксысцкі толькі ў мяне».

І вось калі былі нядаўна выпускныя калёквіумы, прышлося ў адзін і той-жа час, у адным і тым-жа пакоі адказваць адразу гэтыя дзьве гісторыі.

І калі пыталі аб расейска-японскай вайне, кожнаму выкладчыку апавядалі яго дасьледваньне.

Іншыя пераблыталі вумары тлумачэньня. Ім папраўлялі.

Гэта ня вучнёўскі анэкдот на гэтых грамадазнаўцаў, гэта горкая з горкіх—сапраўднасьць. Бо такія факты, не ў «единственном» ліку.

Д.

„Звычайная зьява".

Пры Плешчаніцкім саюзе працасьветы ёсьць каса ўзаемадапамогі. Сябры саюзу могуць атрымліваць пазыкі абавязкова зварочваючы іх у тэрмін. Некаторыя з сяброў выконваюць свой абавязак акуратна, а інш., узяўшы пазыку, што называецца «хвастом пакрываюцца».

Факты: 1. У 1926 годзе ў ліпені м-цы атрымаў пазыку сэкратар Плешчаніцкага райкому ЛКСМБ тав. Прусьлін. Не зьвярнуўшы грошай, ён выехаў з Плешчаніц у г. Смаленск. Не зварочвае пазыку ён і да гэтага часу. На пісьмо праўленьня касы аб звароце пазыкі Прусьлін адказаў вельмі груба і, галоўнае, адмовіўся ад выплаты пазыкі лічачы сябе заплаціўшым.

2. Тав. Міськік бышы сакратар РВК, узяў у касе пазыку у 20 руб. (Прусьлін пазычыў 10 рублёў), і выехаў з Плешчаніц. Срок звароту пазыкі таксама скончыўся, а Міськік сядзіць сабе ў Лепелі і, як кажуць «у вус ня дзьме».

Былі яшчэ выпадкі, што сябры касы, якія былі выпаваты ў касу грошы, не зварочвалі іх па некалькі месяцаў, парушаючы гэтым працу касы і перашкаджаючы другому сябру адтрымаць пазыку.

Трэба сябры—Прусьлін і Міськік—патрабавацца хутчэй зьвярнуць свой доўг.

Праўленьне касы.

Дарэмна нішчыцца багацьце.

(Гразавоя, Грэскага раёну, Менскае акругі).

Зямля бышага панскага маёнтку Гразавок разьмяркована паміж батракамі і беднейшымі сялянамі вакольных вёсак. Але ёсьць тут бышыя панскія палацы, якія і да гэтага часу ўсё больш і больш руйнуюцца прыродаю і людзьмі. Палацы гэтыя мураваныя, вялікія і ня ў такім становішчы, каб іх нельга было адрамантаваць.

Столь у некаторых пакоях абвалілася, паркетная падлога, дзякуючы таму, што ў мінулыя гады тут малацілі цапамі збожжа бышыя батракі, таксама павывальвалася, дзьверы нараскрадалі і хутка застануцца толькі голыя сьцены.

А між тым адрамантаваць гэтыя палацы куды лягчэй чым пабудаваць новы дом. Тут можна было-б адчыніць добрую двухкамплектную школу, або скарыстаць на што іншае. Тым больш што тут і прыродныя ўмовы спрыяюць адчыненьню двухкамплектавай школы, ёсьць вялікі сад, садкалка, парк і іншае.

Трэба Грэскаму РВК пастарацца адрамантаваць гэтыя дом і скарыстаць яго, а то надалей пры гэткім доглядзе і сьцены разбурацца.

Грозаўскі.

ДАСЯГНЕНЬНІ ВЭТЭРЫНАРНАЕ СПРАВЫ.

Пачаткам правільнага разьвіцьця вэтэрынарнай справы ў нашай Рэспубліцы зьяўляецца 1924 г., калі быў зацьверджаны ЦВК вэтэрынарны статут.

З гэтага часу вэтэрынарная праца пачынае паступова разгортвацца па ўсіх галінах.

У першаю чаргу ўся ўвага была зьвернута на пашырэньне сеткі і вэт-урачэбных вучасткаў, пабудоўку пры іх больніц і амбуляторый і лепшую забясьпечанасьць вучасткаў лекавымі сродкамі і іншымі прыладамі. У 1924-25 годзе сетка вэт-урачэбных вучасткаў складалася з 67 вучасткаў, 25-26г.—92, ў 26-27г.—іх было 100 (бяз Гомельшчыны). На пабудоўку новых вэтэр. больніц і амбуляторый, у працягу 2-х год было адпушчана 290.000 руб. Лекавая дапамога захварэўшай буйнай сельска-гаспадарчай жывёлы, ў сувязі з павялічэньнем колькасьці вучасткаў, таксама ўзрасла.—Так, проц. прынятых захварэўшых жывёл, у адносінах усёй колькасьці іх, у 24-25 годзе быў 6,6, у 25-26—10,1; у дарэвалюцыйны час (1912 г.) гэты процант быў 3,5.

Трэба заўважыць, што 94 проц. ўсіх захвараўшых жывёлы адносіцца да незаразьлівых хвароб, прычым гэта захворваньне выклікаецца, галоўным чынам, няўмелым кармленьнем і уходам за жывёлай.

Аказаньне лекавай дапамогі затрудняецца надта вялікай плошчай вэт-урачэбных вучасткаў. У 26-27 годзе плошча аднаго вучастку ў сярэднім займала 1100 кв. кілёмэтраў.

Апрача таго, лекавая дапамога тлумачыцца слабым абсталяваньнем вучасткаў і недахопам вэтэр. мэдыкамэнтаў, а таксама слабым укамплектаваньнем вэт.-урачэбных вучасткаў дактарамі.

У галіне барацьбы з эпізоотыямі вэтэрынарная арганізацыя мае значнае дасягненьне, ліквідаваўшы эпізоотыю повальнага запаленьня лёгкіх буйных рагатай жывёлы ў Мазырскай акрузе, дзе гэтая эпізоотыя на працягу 10-ці гадоў наносіла вялікія эканамічныя страты насельніцтву.

Праведзена значная праца па прыгатаваньні прэпаратаў, якія ўжываюцца для прышчэпак жывёлам. У 26-27 г. выпушчана 2298,5 літраў гэтых прэпаратаў на 100 проц. больш, чым у папярэднім годзе.

Дзеля бесперабойнага разьвіцьця экспарту прадуктаў жывёлагадоўлі штогодна пашыраецца сетка вэтсанітарных транспартных вучасткаў пры чыгуначных станцыях.

Вялікая ўвага аддаецца культурна-асьветнай працы сярод вясковага насельніцтва: вядуцца гутаркі па вэтэрынарыі, чытаюцца лекцыі, наладжваюцца курсы. Уся гэта праца дапамагае азнаямленьню вясковага насельніцтва з задачамі вэтэрынарнай справы і пашырае ўдзел самаго насельніцтва ў будаўніцтве вэтэрынарнай справы на абшарах Рэспублікі.

У заключэньне трэба адзначыць, што савецкая вэтэрынарыя мае вельмі значныя дасягненьне ў параўнаньні з даваеннага часам, але для поўнага задавоненьня вэтэрынарных патрэб насельніцтва неабходна далейшае ўмацаваньне існуючых вэтэрынарных арганізацый і паступовае адчыненьне новых вэтэрынарных установаў.

С. Серпаў.

„ТАКАЯ НАША БЕЛАРУСЬ".

(Новая фільма Белдзяржкіно).

Гэту фільму здымаюць не на спэцыяльных кіно-фабрыках. Для фільмы ня іграе ні адзін сапраўдны артыст. І ўсё-ж гэта фільма будзе цікавай, блізкай, дарагой для нас. Жывую Беларусь, такую, як яна ёсьць, пакажа нам гэта фільма.

У Менску зараз здымаюць „Каліноўскага", „Лекерта". На вуліцах носяцца казакі; суровы Мураўёў напамінае мінулы жах. На плошчы Парыскае Камуны з самой раніцы ажываюць старонкі гісторыі. Затое ні разу не спаткаеце вы на вуліцах экспэдыцыю, якая-б здымала «Нашу Беларусь». Усё тое, што бачаць вочы, будзе зазьнята ў фільме. Ні аднэй дэкарацыі, ні аднэй штучнай сцэны.

Фільму робіць трое: рэж. Астроўскі і Пятроў і апэратар Шлюглейт. Апошні ўжо добра ведае твар нашай Беларусі: ён удзельнічаў ў здымку „Лясная Быль".

Сцэнары фільмы „Такая наша Беларусь" падзяляецца на дзьве часткі.

— Беларусь такая, якую мы атрымалі ад палякаў.

— Сёньнешняя Беларусь.

Толькі два пункцікі. А якая багатая карціна!

У фільме будзе ўся Беларусь: больш значныя фабрыкі, буйнейшыя савецкія гаспадаркі, лепшыя сялянскія гаспадаркі і інш.

Экспэдыцыя „Нашай Беларусі" на гэтых днёх закончыла сваю працу ў Менскай акрузе. Тут зрабілі 25 проц. усёй фільмы.

Рэжысэр т. Астроўскі апавядае:

— Каля Менску ёсьць шмат цікавых месцаў для будучай фільмы. Нам ігралі сяляне; у нашай фільме галоўнымі артыстамі будуць „трактары". Можна сабе ўявіць, з якім захапленьнем будзе глядач сачыць за экранам, дзе тоўстыя беларускія каровы раскажуць аб тым, як расьце наша сельская гаспадарка. У Менску ёсьць яшчэ шмат сьлядоў польскай акупацыі, і гэтыя крывавыя сьляды ў нашай фільме уваскрасяць 1920-21 гады.

У Менску ўжо зазьняты новыя, нядаўна пабудаваныя фабрыкі, больш буйныя культурныя асяродкі. Частка здымкаў ужо зроблена і ўГомелі. Зараз экспэдыцыя пераяжджае ў Віцебск.

Тав. Астроўскі скардзіцца, што яшчэ ня ўсюды прыходзяць на дапамогу экспэдыцыі. Аб фільме ня ўсюды ведаюць і на атрыманьне дазволу здымаць трапіцца шмат дарагога часу.

Фільма „Такая наша Беларусь" будзе зроблена праз некалькі месяцаў. У дні сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі гэта фільма будзе мільгаць па ўсіх кіно-экранах БССР. Але ня толькі мы будзем глядзець на сваю ўзмацнеўшую прамысловасьць і гаспадарку: фільма пойдзе на кіно-экраны братэрскіх рэспублік і іх азнаёміць з нашым жыцьцём.

Ні аднэй дэкарацыі, ні аднэй штучнай сцэны... Трактары, каровы, коні—вось «артысты» гэтай цікавай фільмы.

Я.

ХРОНІКА.

10.000 руб. на пабудоўку клюбу.

ЦП саюзу транспартнікаў адпусьціла 10.000 руб. на пабудову клюбу для рабочых. Пабудоўка клюбу ўжо пачалася на Няміга-Ракаўскай вуліцы.

Заля клюбу разьлічана на 300 месцаў.

«Дом адпачынку імя 11-га ліпеня».

Работу па пабудове «Дому адпачынку» у Ждановічах на поўным ходзе. Будуецца 3-ці паверх. Дом будзе дзейнічаць і зімой. прычым разьлічаны на 150 адпачываючых.

Арганізацыя акц. т-ва «Белторф».

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў арганізаваць беларускае акцыянэрнае т-ва «Белторф».

Т-ва будзе кіраваць торфа распрацоўкамі па Беларусі.

Перадача Белсельсаюзу дзяржзямельнай маемасьці.

Наркамзем зараз праводзіць перадачу ў бясплатнае карыстаньне калектыўных гаспадарак дзярж.-зямельнай маемасьці на тэрыторыі іх. Перадаюцца сады, будынкі, прадпрыёмствы, жывы і мёртвы інвэнтар і інш.

На мясцох утвораны акруговыя камісіі па перадачы кал. гаспадаркам памянёнае маемасьці.

Пасьля пераходу яе пад загад Белсельсаюзу, будзе зьвернута ў першую чаргу ўвага на правядзеньне машынізацыі прадпрыёмстваў.

У «МАЛАДНЯКУ».

Вышлі з друку наступныя маладнякоўскія кніжкі:

С. Фахін—«Балота» (поэма). В. Сташэўскі—п'есы (для вясковага тэатру).

Здаюцца ў друк: А. Гародня—«На крэсах» (апавесьць). М. Лынькоў—„Апавяданьні".

Падрыхтаваны:

Валеры Маракоў—«На залатым пакосе» (вершы). А. Дудар—«Марсэльеза» (апав.).

Рыхтуюцца да друку:

Васіль Каваль—«Палын» (апавесьць). А. Трус—«Зялёны Яр» (вершы). А. Якімовіч—Збор вершаў. З. Бандарына—«Звоны-перазвоны» (вершы).

Учэбныя палёты.

12-га ліпеня на аэрадроме адбыліся вучэбна-тэарытычныя заняткі чырвонаармейцаў па авіяцыі. Апошнія знаёміліся з канструкцыяй самалётаў.

Пасьля заняткаў адбыліся вучэбныя палёты ў якіх удзельнічалі каманды склад і чырвонаармейцы.

У Нар. Кам. Р.-С. Інспэкцыі.

Вымова.

За несвоечасовую падрыхтоўку рэальных пляноў і нячырыняцьце патрэбных мер да рэалізацыі пазыкі гаспадарчага аднаўленьня, калегія Р.-С. Інспэкцыі пастанавіла абвясьціць вымову т. Лысаву.

Пад дысцыплінарны суд.

Калегія РС Інспэкцыі пастанавіла перадаць дысцыплінарнаму суду праўленьні Віцебскага і Магілёўскага т-ваў с-г. крэдыту за ўзіманьне высокіх проц. ставак, перавышаючых размер, які ўстаноўлен інструкцыяй СНК БССР.

Да судовай адказнасьці.

Кал. РС Інспэкцыі пастанавіла перадаць пракуратуры акты абсьледаваньня Магілёўскага, Ушацкага і Талькаўскага крэдытных т-ваў для прыцягненьня да судовай адказнасьці за няправільнае накіраваньне надзвычайных сродкаў, у прыватнасьці з фонду беднаты.

СУД.

Справа селяніна Цацэркі.

Ганна Ярмаловіч—прыгожая дзяўчына. Ёй самае больш—20 год. Ганна любіць працу. Недарэмна завуць яе працаздольнай дзяўчынай. Але любіць Ганна і жыцьцё—маладая!

Матар'яльнае становішча Ганны—дрэннае. Маці—старуха, братоў—няма. Усё прыходзіцца рабіць самой.

Да Ганны ўдаецца многа „прэтэндэнтаў", а яна ні на каго не зьвяртае ўвагі: шкада пакідаць сям'ю.

Але з кожным годам матар'яльнае становішча Ярмаловічаў робіцца ўсё горш і горш.

Быў адзін выхад—выдаць Ганну замуж.

На аднэй з вясковых вечарынак яна выпадкова пазнаёмілася з жыхаром суседняй вёскі селянінам Цацэрка. Пазнаёміліся. Пагулялі некалькі тыдняў і... запісаліся.

Першыя месяцы жылі добра. Цацэрка робіць Ганьне падарункі, не забывае і пра старую маці. Але толькі першыя месяцы.

Ня зышліся характарам, і пайшлі штодзённыя лаянкі.

Аб падарунках ужо не ўспаміналі: тыднямі не гаварылі.

Часта Ганна хадзіла да маткі ў в. Падсудзерава, Шаўлаўскага сельсавету, Полацкае акругі. Жыла ў яе тыдзень—другі.

Варочалася дамоў толькі тады, калі сюды-ж прыходзіў яе муж, які пачынаў буяніць, біць шыбы, пагражаў забіць...

Такое „сямейнае" жыцьцё Ганны цягнулася два-тры месяцы. І вось, калі жыцьцё стала зусім немагчыма, Ганна рашыла назаўсёды вярнуцца да маткі.

Раз мужа ня было дома—пашоў па справах. Ганна сабрала свае рэчы, апошні раз зірнула на хату, дзе знайшла гэтульк гора і пашла да маткі.

Цацэрка зьвярнуўся дамоў увечары, абышоў хату.

— Жонкі няма!

Суседзі сказалі, што яна з усімі сваімі рэчамі пашла ў напрамку на в. Падсудзерава.

У гэтым-жа напрамку пашоў і Цацэрка. А ноччу згарэла хата старой Ярмаловіч: гэта адамсьціў «пакінуты муж».

Выязная сэсія Віцебскага акруговага суду прыгаварыла Цацэрка за падпал на 3-ы гады зьняволеньня. **С—і.**

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Бранд „шукае" кватэру.

Карыстаючыся сваёй пасадай малодшага міліцыянэра, Р. Бранд самавольна заняў чужую кватэру (г. Ворша), выкінуўшы ўсю маёмасьць гаспадара кватэры на вуліцу і ўжо было рыхтаваўся пасяліцца тут на ўвесь час.

Але „няпрошанага госьця" арыштавалі. Аршанскі акруговы суд прысудзіў яго за самавольнае заняцьце кватэры на тры гады зьняволеньня ўмоўна.

Справа лясьніка Труса.

Лясьнік Трус працаваў у Азярычынскім лясьніцтве, Мазырскае акругі. Абкладаў Трус не рабіў, лес у яго рубалі «на ўсю».

У часе рэвізіі выкрылі „лясьніцкія здольнасьці" Труса. Мазырскі акр. суд прыгаварыў яго на тры гады зьняволеньня.

Здарэньні.

Ад п'янства—да забойства.

У вёсцы Кнорына (Менск. акр.) 4 ліпеня гр-н П. Астапчык у часе п'янкі зарэзаў свайго сябра па бутэльцы гр-на М. Байка.

Пярун забіў.

Ноччу на 6 ліпеня ў б. маёнтку Галоўчыцы (Мазыршчына) у часе навальніцы пярун забіў гр-н Л. Вадзэка і Б. Цыгра.

Папраўкі.

У апублікаванай 7 ліпеня г.г. у газэце «Савецкая Беларусь» № 151 пастанове Савету Народных Камісараў **«Палажэньне аб навуковых працаўніках вышэйшых школ і навуковых устаноў БССР»** аказаліся памылкі, якія павінны быць выпраўлены наступным чынам:

1) У арт. 14 надрукавана: «дацэнты—на 6 год», а павінна быць «дацэнты—на 5 год»;

2) У арт. 19 словы: «на права выкладаньня данае спэцыяльнасьці ў вышэйшых школах»—касуюцца;

3) У арт. 29 надрукавана: «дыплём падпісваецца Народным Камісарыятам Асьветы», а павінна быць: «дыплём падпісваецца Народным Камісарам Асьветы».

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. МАРОЗ.

— У № 156 (2048) нашае газэты (за 13 ліпеня г.г.) у **Табліцы выйгрышаў 1-й Усебеларускай Грашовай Лётарэі Дапамогі Беспрытульным Дзецям** (за 11 ліпеня 1927 г.) у 6-м слупку па недагляду карэктуры ўкралася абмылка: надрукавана 261395, а павінна быць **261394**.

Апавяшчэньні.

Агульна-гарадзкі сход сэкцыі працаўнікоў друку разам з мясцкомам Белдзяржвыдавецтва адбудзецца ў пятніцу 15 ліпеня, а 7 гадз. ўвеч. у сядзе друкароў (Ленінская 20).

Парадак дню:

1. Аб «Тыдні Абароны.
2. Бягучыя справы.

Пасьля агульнага сходу будзе кіно-фільма.

БЮРО СЭКЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ. МЯСЦКОМ БДВ.

— У нядзелю 17 ліпеня, а 9 гадзіне раніцаю групком № 2 саюзу Белпрацасьветы наладжвае для сяброў групкому гуляньне ў Крупцах. Праезд на аўтабусах дарэмны Збор у групкоме Ленінская 21.

Групком.

Адказны рэдактар **М КУДЗЕЛЬКА.**

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

З 15 да 24 ліпеня—гастролі ансамбля Маскоўскага тэатру б. Корш.

Пятніца, 15 ліпеня.	Субота, 16 ліпеня.	Нядзеля, 17 ліпеня.
„Рэмесло господина Кюрэ"	„Касатка".	„Тревожный звонок"
Камэдыя ў 5 дз.	Камэд. у 4 дз.	Камэд. ў 4 дз.

Пачатак а 9-й гадз. веч. Білеты прадаюцца ў касе тэатру.

КІНО

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	З аўторка, 12-га ліпеня, вялікі савецкі баявік „МАРЫЙКА". у 7 частках.
КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА».	З аўторака, 12-га ліпеня. Выключна трукавая фільма „ТАИНСТВЕННАЯ ГАЦИЕНДА". Звыш праграмы—гастролі самых папулярных у СССР сатырыкаў БАРЫСАВА І ЗАДОЛЬСКАГА.
ЛЕТНІ САД ПРАЦАСЬВЕТЫ.	Серада, 13.VII. і субота, 16.VII. Кіно-пастаноўка „ТАРАС ШЭЎЧЭНКА"—2 сэрыі Пачатак а 10-й гадз. веч.

ПРЫМАЕЦЦА ДАЛЕЙШАЯ ПАДПІСКА НА 2-ю ПАЛОВУ 1927 ГОДУ на паўтара-месячную часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі

„ПОЛЫМЯ"

ГАДАВЫЯ падпішчыкі на 1927 год атрымоўваюць па выбару бясплатна літаратурны дадатак на ДЗЬВЕ КНІЖКІ беларускіх пісьменьнікаў і паэтаў; паўгадавыя падпішчыкі атрымліваюць па аднэй кніжцы.

Акрамя таго, гадавым падпішчыкам прадастаўляецца рассрочка: 1 студзеня—4 р.; 1 ліпеня—3 р. 50 к.; 1 кастрычніка—2 р. 50 к..

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На год	10 руб. — кап
„ 6 месяцаў	5 руб. — кап.
„ 3 месяцы	2 руб. 50 кап.

Асобны нумар каштуе 1 руб. 50 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у рэдакцыі часоп. «Полымя» (Менск, Савецкая 63); у Цэнтральнай кнігарні Белар. Дзяржаўнага Выдавецтва (Менск, вугал Ленінскай і Савецкай, 19); ва ўсіх акруговых аддзеленьнях Бел. Дзярж. Выдавецтва: ва ўсіх паштовых аддзеленьнях і ў канторы падпіскі на газеты «Правда» і «Известия» (Менск, Сав. 61).

ВЫ ХОТИТЕ ИМЕТЬ ВЕРНЫЙ ЗАРАБОТОК?

Требуйте новую книгу проф. Ленингр. Политех. Института В. В. ВАЛЬГИСА. Сборник технохимических рецептов и производственных советов, составленную по новейшим проверенным немецким, американским, английским и французским данным, 40 печатных листов, 600 стр., свыше 2000 всевозможных рецептов и практических советов по всем видам производства. С приложением алфавитного указателя основных процессов, приборов и сырья, а также новые законы о кустарных и промысловых предприятиях.

——— Цена сборника в переплете 6 руб. 40 коп. ———

—— Заказы высылаются наложенным платежом ——

Требования и деньги (можно марками) направлять по адресу: Москва, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „КНИЖНАЯ ПОЛКА".

——— Подробный проспект высылается за 2-8-ми коп. марки. ———

ЗГУБЛЕНЫ:

— Асабовая кніжка Буласў С. К., выд. Халапеніцкім РВК.

— Спраўка аб скарачэньні штатаў, Суво О. Р. № 2264, выд. спрінк. фабрыкай «Дняпра».

— Пасьведчаньне Суво О. Р. № 4078, выд. Канатопскай міліцыяй.

— Картка на каня Шынкевіч Б. С. № 470, выд. Барысаўскім РВК.

— Картка на каня Шынкевіч С. В. № 748, выд. Веляніцкім ВВК.

— Асабовая картка Ржэўскі І. А. № 179/50, выд. Глівенскім ВВК.

— Сяброўская кніжка Кандрацьеў Т. К. № 1187, выд. Халапеніцкім МК Працасьветы.

— Лекавая кніжка Керман А. М., выд. Барысаўскай Страхкасай.

— Чырвонаармейская кніжка Александровіч А. Ю., выд. 4-м Чырвонаазнаменскім палк.

— Сяброўскі білет Александровіч А. Ю., выд. Барысаўскім ВВО Саматужн.

— Сяброўскі білет Юрэвіч С. Ф., выд. саюзам Сав.-гандлёв. служачых.

— Кніжка на каня Абрамовіч Ж. Г., выд. Веляніцкім ВВК на імя Касьцюковіча І. Л.

— Кніжка на каня Кота Т. М., выд. Веляніцкім ВВК.

— Асабовая кніжка Гэц І. П. № 344, выд. Барысаўскім РВК.

— Сяброўскі білет Бордонаў М. А., № 6/18114, выд. Слуцкім саюз. Будаўнікоў.

— Асабовая кніжка Бардонаў М. А. № 185, выд. Барысаўскім Васенкамат.

— Безыменны гадовы білет Бардонаў М. А. № 1295, выд. ПКПС супрац. 7-га вуч. мясц. транспарт.

— Дакумант Беленькая Д. Я., выд. Бар. Натарыусам Стрыгуцкім.

— Сяброўскі білет Раскінд Х. Ш. № 6/14791, выд. Барыс. саюз. Будаўнік.

— Сяброўскі білет Раскінд Х. Ш. № 125, выд. касай узаемадап. саюз. Будаўнік.

— Сяброўскі білет Спікер К. Е. № 111.115 выд. Мен. саюзам Гарбарнікаў.

— Дзьве накладныя Бадуля М. І. № 2831, выд. Барысаўскім Лесбелам.

— Пасьведчаньне Перс Ш. М. выд. Бярэзінскім РВК.

— Сяброўскі білет Франкевіч Ф. Е. № 15330 выд. Барыс. саюз. Гарбарнікаў.

— Камсамольскі білет Франкевіч Ф. Е. № 21507, выд. Барыс. АКЛ КСМБ.

— Сяброўскі білет Бадуля М. І. № 19925, выд. Барыс. саюз. Працзямлес.

— Сяброўскі білет Бадуля І. І. № 19928, выд. Барыс. саюз. Працзямлес.

— Сяброўскі білет Міцельская І. Ф. № 127, выд. Барысаўскім саюз. Нархарч.

— Сяброўскі білет Чарэўка К. Н. № 103, выд. Барыс. саюз. Сав.-гандлёв. служач.

— Лекавая кніжка Чарэўка К. Н., выд. Барысаўскай Страхкасай.

— Сяброўская кніжка Чарэўка К. Н., выд. касай узаемадап. саюз. Савганд.

— Сяброўскі білет Алісіевіч А. С. № 29304, выд. Барыс. саюз. працзямлес.

— Сяброўскі б. Вавілоў А. М. № 49318, выд. Нова-Барыс. саюз. чыгуначнік.

— Пасьведчаньне Вавілаў А. М. № 797, выд. чыгуначнай канторай.

— Кааперацыйная кніжка Вавілаў А. М., выд. Менскім ТПО.

— Сяброўскі білет Міцькін Л. С., выд. Барыс. саюз. Працасьветы.

— Асабовая картка Міцькін Л. С., выд. Барыс. Акрваенкамат.

— Пасьведчаньне Міцькін Л. С., выд. Барыс. вучпунктам.

— Чырвонаармейская кніжка Шалайка Т. А., выд. 2-м Артпалком.

— Сяброўскі білет Чыцік Н. П. № 20365, выд. Барыс. саюз. Працзямлес.

— Кніжка на каня Беляноўскі В. № 318, выд. Зембінскім ВВК.

— Каапэр. кніжка № 1435, Маніковская А., выд. МЦРК кв. 3795.

— Пасьведчаньне № 467 Лабачэўскага К. Н. выд. БДУ кв. 3796.

— Лекавая кніжка Лабачэўскага К. Н. выд. Менстрахкасай кв. 3797.

— Сябр. білет № 1325558 Коўбана С. С. выд. Бабр. адд. саюза мэталістаў кв. 3798.

— Кніжка на каня № 3827 Лагуценка Ф. С., выд. Хоцімскім РВК кв. 3799.

— Пасьведчаньне Фрэнкель Х. выд. Асіпавіцкай сямігодкай кв. 3800.

— Картка на каня Клебановіча А., выд. Грэскім ВВК кв. 3801.

— Сябр. кніжка Далганавай Е., выд. Сенгелейскім саюзам нархарч кв. 3802.

— Сяброўскі білет № 40275 Юркевіча Н. К. выд. саюзам працзямлес кв. 3803.

— Картка на каня № 213 Вязручэнка Р., выд. Краснапольскім РВК кв. 3804.

— Картка на каня № 5569 Гаўрыленка С. Д. выд. Хоцімскім РВК кв. 3805.

— Картка на каня № 4934 Асмалоўскага А. Ф. выд. Хоцімскім РВК кв. 3806.

— Кніжка на каня № 10650 Шахновіча М., выд. Слуцкім РВК.

— Кніжка на каня № 1451 Грак А., выд. слуцкім РВК.

— Картка на каня № 8097, 8098 Шуляхоўскага А., выд. Слуцкім РВК.

— Вайсковая кніжка № 251-101 Дабралёт А., выд. Слуцкім РВК.

Галоўліт(сл) 24814.

Менск, 1-я дзяржаўная друкарня.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2